

ПРОФІЛЬ ЖАРТАЎ І ЗАБАЎ

ЧЫРВОНКА



МОДА БЫЦЬ СТЫЛЬНЫМ

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ЛІСТАПАДА 2020 г. ЧАЦВЕР № 231 (29345)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:**

*«Будучая пяцігодка стане для нас пяцігодкай мадэрнізацыі электрасеткавай інфраструктуры. Плануецца практычна ўдвая павялічыць аб'ёмы рэканструкцыі электрасетак. Калі цяпер мы штогод рэканструюем блізу 1500—1700 км ліній электраперадач, то да 2022/2023 года неабходна выйсці на 2700 км. Гэта дазволіць пашырыць магчымасці для падключэння жыллёвага фонду да электраэнергіі для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння, а таксама істотна павысіць надзейнасць электрасеткавай інфраструктуры».*

# «І не знікаць Паэтам вечна, У вечнай Песні жывучы»...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Супрацоўнікі музея Вольга ГУЛЕВА і Святлана КАЖАМЯКА сярод экспанатаў выстаўкі.**

Да 90-гадовага юбілею Уладзіміра Караткевіча, што адзначаецца якраз сёння, па ўсёй Беларусі ладзяцца цікавыя экспазіцыі і імпрэзы. Учора мы завіталі на адну з самых цікавых і вобразных — у Дзяржаўны музей беларускай літаратуры. Там сумесна з Нацыянальным мастацкім музеем і Цэнтральнай навуковай бібліятэкай Акадэміі навук зладжана часовая экспазіцыя «Уладзімір Караткевіч у выяўленчым мастацтве».

Для многіх будзе адкрыццём, што пісьменніка яшчэ пры жыцці малявалі мастакі і ляпілі скульптары. Яго асоба натхняла, як і яго творы, — у экспазіцыі можна ўбачыць ілюстрацыі да Караткевічавых кніг работы Генадзя Грака, Пятра Драчова, Міколы Купавы, а таксама афішы з пастановак Вялікага тэатра «Сівая легенда», «Дзікае паляванне караля Стаха», эскізы касцюмаў да «Ладдзі Роспачы». Прадстаўлены работы і самога пісьменніка — ён нядрэнна маляваў.

*«Свет шчодры. // Свет мяне паўторыць... // Ну, а не свет, // дык Беларусь. — // Мне — досыць...»* Ён гэта ведаў. Беларусь яго памятае, ім натхняецца, яго паўтарае.

## КОРАТКА

• Навуковая канферэнцыя «Каля вытокаў і ў авангардзе беларускай паліталогіі», якая аб'ядноўвае больш за 50 палітолагаў з пяці краін, пройдзе 27 лістапада ў БДУ.

• **У Беларусі стартуе рэспубліканская акцыя ўзнагароджання ганаровых донараў крыві і яе кампанентаў.**



• Кірмаш вакансій у рэжыме анлайн для моладзі Магілёва пройдзе 10 снежня.

• **Квартал электрадамоў пабудуюць у Віцебску.**

ISSN 1990 - 763X

20231>

9 771990 763008

Сезонны інтарэс

# «ЛЕПШЫ ЦЮНІНГ ДЛЯ МАШЫН — ПРАВІЛЬНЫ ПРАТЭКТАР ШЫН»



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

**Менавіта пад такім слоганам будзе праводзіцца Рэспубліканская прафілактычная акцыя, якая ініцыяваная на нашых дарогах Дзяржаўтаінспекцыяй краіны. Яна пройдзе з 25 лістапада да 4 снежня. Пра гэта паведаміў старшы інспектар па асобых даручэннях аддзялення арганізацыі міжведамаснага ўзаемадзеяння і прапаганды бяспекі дарожнага руху ДАІ МУС Рэспублікі Беларусь Аляксандр БРУЙ.**

Прадстаўнік ДАІ таксама адзначыў, што з 2015 года на заканадаўчым узроўні замацавана абавязковае выкарыстанне зімовых шын на транспартным сродку ў перыяд з 1 снежня да 1 сакавіка. Падрыхтоўку да зімовых умоў павінен прайсці кожны аўтамабіль. Патрабаванне да зімовых шын аўтамабіляў: вышыня рэльефа пратэктара павінна быць не менш за 4 мм.

СТАР. 3

Спажывецкі кошык

# Зімовы асартымент

## Колькі каштуюць «вітаміны» на «Лебядзіным»

**З якімі прыкметамі вы звязваеце набліжэнне зімы? Напэўна, для любога гарадскога жыхара гэта, сярод іншага, змена асартыменту на адкрытых прадуктовых рынках.**



СТАР. 4

Ва ўрадзе

# СПРАЦАВАЛІ ПА МАКСІМУМЕ

**Учора ў Палацы Рэспублікі адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння дзяржаўных узнагарод людзям, якія зрабілі значны асабісты ўклад у развіццё нашай краіны, самых розных яе сфер: ад ветэранскага руху да сельскай гаспадаркі, лёгкай прамысловасці і транспарту. Узнагароджванне адбывалася з захаваннем усіх норм, якія рэкамендуе Міністэрства аховы здароўя ва ўмовах эпідэміялагічнай абстаноўкі ў Беларусі. На ўваходзе ва ўсіх удзельнікаў правяралася тэмпература, у зале людзей размясцілі на дастатковай дыстанцыі адзін ад аднаго. Журналісты і персанал былі ў медыцынскіх масках. Гэтыя меры прыўносілі нотку суму, як бывае, калі змяняецца нешта звыклае і звычайнае ў жыцці, але гэта ніяк не зменшыла заслугі людзей, што атрымалі з рук кіраўніка ўрада медалі, граматы і кветкі.**

«Гэта цудоўная магчымасць адзначыць дасягненні людзей, якія заслугоўваюць таго, каб пра іх ведала ўся краіна, сардэчна падзякаваць ім за самаадданую працу, талент і прафесійнае майстэрства, — звярнуўся да прысутных **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА.** — ...Кожны з гэтых людзей дабіўся значных, а часам і выдатных вынікаў у сваёй прафесійнай дзейнасці, унёс вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне нашай Айчыны».

Прэм'ер дадаў, што ў гэтых выніках вялізнае маральнае значэнне, бо дасягненні людзей, якія атрымалі ўзнагароды, — арыенцір для моладзі і дастойны прыклад таго, як трэба рэалізоўваць свае таленты і памкненні. «Толькі дзякуючы карпатлівай працы мацнее наша Беларусь, грамадства набывае сапраўдную годнасць», — дадаў ён.

Сярод узнагароджаных было шмат работнікаў аграпрамысловага комплексу, які сёлета спрацаваў стабільна, забяспечыў беларусаў харчаваннем, зарабляе для краіны валюту. «Зладжаная і самаадданая праца вас, аграрыяў, дазволіць сёлета сфарміраваць па шэрагу культур рэкордныя паказчыкі. Агульны намалот склаў практычна 9,5 мільёна тон, павялічана вытворчасць мяса, малака, гародніны, садавіны, словам, аграрыі папрацавалі слаўна», — адзначыў прэм'ер.

Свае ўзнагароды атрымалі работнікі Беларускай чыгункі, дзе з пачатку года прыйшлося адказваць на беспрэцэдэнтныя выклікі, прадыктаваныя пандэміяй.

За ўклад у спыненне эканамічных правапарушэнняў узнагароджаны работнікі падатковых органаў краіны. «Ваша кампетэнтнасць і плённы пошук шляхоў да далейшай аптымізацыі падатковай сістэмы фарміруюць асновы для дынамічнага росту нацыянальнай эканомікі і дабрабыту грамадзян», — падзякаваў ім кіраўнік Савета Міністраў.

Дзяржава адзначыла і прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі. «Ва ўсе часы роля культуры ў грамадстве бясцэнная. Беларускае мастацтва традыцыйна замацоўвае ідэалы прыгажосці, дабрыні, справядлівасці, выконвае значную ролю ў фарміраванні маральных і эстэтычных каштоўнасцяў народа, — падкрэсліў Раман Галоўчанка. — Дзякуючы вам, людзям таленавітым, творчым, натхнёным, неабыякавым, нацыянальная культура атрымлівае новае вымярэнне. Плён вашай дзейнасці служыць не толькі крыніцай радасці, але і падштурхоўвае людзей да глыбокіх высноў і ацэнак. Гэта вельмі адказная місія, якую вы з гонарам выконваеце, калі захоўваеце вернасць высокім ідэалам мастацтва і дзяржавы».

Падзяку ад дзяржавы атрымалі прадстаўнікі навукі, адукацыі, сацыяльнай абароны, будаўніцтва, грамадскіх аб'яднанняў.

«Дарагія сябры, сёлета споўнілася 30 гадоў з дня прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. Можна з упэўненасцю сказаць, што менавіта вы залажылі працоўныя і культурныя традыцыі нашай маладой дзяржавы», — рэзюмаваў прэм'ер-міністр.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Медыяпрастора

# АНТЫФЭЙК СТАНОВІЦЦА АСОБНЫМ ЖАНРАМ

**Учора ў Мінску прайшоў XIV з'езд Беларускага саюза журналістаў. У яго рабоце ўзялі ўдзел дэлегаты, якія прадстаўляюць журналісцкую супольнасць усіх рэгіёнаў краіны, грамадскія і дзяржаўныя дзеячы. На з'ездзе былі ўзнятыя найбольш актуальныя пытанні развіцця сродкаў масавай інфармацыі. Яго лейтматывам стала тэма «Журналістыка ў эпоху новых медыя, постпраўды і фэйк-ньюс».**



Фота БелТА.

У прывітанні Прэзідэнта, адрасаваным удзельнікам журналісцкага форуму, якая была засяроджана на гэтай жа тэме: «Сёння грамадства пастаўлена перад глабальным выклікам. Эпоха постпраўды і фэйкньюс разбурае класічныя нормы і прынцыпы прафесійнай журналістыкі, ператварае інфармацыйную медыяпрастору ў поле бою геапалітычных інтарэсаў, у цэнтры якіх знаходзіцца і Беларусь. Інструментам рэалізацыі амбіцый нядобрасумленных палітыкаў і паліттэхнолагаў выступае прэса, у тым ліку так званыя новыя медыя. Не абмяжоўваючы сябе этычнымі рамкамі, такімі як аб'ектыўнасць, сумленнасць, мараль, яны ставяць пад пагрозу нашы гістарычныя, культурныя, агульначалавечыя каштоўнасці, інфармацыйны суверэнітэт і дзяржаўнасць». Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што журналістам пад сілу знайсці адэкватны і прафесійны адказ на агрэсіўнае дэструктыўнае ўздзеянне на свядомасць беларусаў.

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ,** які зачытаў прывітанне на з'ездзе, адзначыў: «Глыбіня асэнсавання, аналітыка сучасных інфармацыйных выклікаў і падзей, якія адбываюцца на іх фоне, працэсаў, у падачы журналістаў-прафесіяналаў сёння — гэта якраз такі тое, што здольна праліць святло на многія рэчы, даць нашым людзям аб'ектыўную карціну таго, што адбываецца, і зберагчы наш народ ад сур'ёзных хваляванняў. Невыпадкова ў поствыбарны перыяд менавіта журналісты дзяржаўных СМІ падвергліся небываламу ціску і ганенням з боку дэструктыўных сіл. Іх задума зразумелая — абваліўшы сістэму дзяржаўных СМІ, яны могуць перакуліць дзяржаву ў цэлым. Што яшчэ раз пераканаўча пацвярджае словы Прэзідэнта аб тым, што журналістыка — прафесія дзяржаўная».

Андрэй Кунцэвіч нагадаў, што беларускі лідар акцэнтаваў увагу на неабходнасці ліквідаваць існуючы прабел у патрыятычным выхаванні грамадзян. «Мяркую, што без актыўнага ўдзелу нашых медыя Беларускага саюза журналістаў паўнавартаснае рашэнне гэтай задачы наўрад ці магчымае», — сказаў ён.

«Беларусь і журналісцкая супольнасць не пачыналі гэтую эпоху постпраўды і фэйк-ньюс. Нас, па сутнасці, пагрузілі ў гэтую эпоху. Прычым у такім рэактыўным рэжыме, асабліва з пачатку бягучага, вельмі няпростага года. Але да гонару беларускіх журналістаў у сваёй большасці ўсе прытрымліваюцца этычных стандартаў прафесіі», — адзначыў **старшыня праўлення Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ** (дарэчы, на форуме ён быў пераабраны на гэтую пасаду). Паводле яго слоў, верыфікацыя даных, праверка фактаў на дакладнасць становяцца адным з ключавых кірункаў работы сучаснага журналіста. «Уласна кажучы, антыфэйк становіцца асобным жанрам журналістыкі, які, дарэчы, вельмі папулярны ў нашых чытачоў, падпісчыкаў, гледачоў, фаловераў, радыёслухачоў. Таму, на мой погляд, нашы калегі, беларускія журналісты, тэхнічна, этычна, маральна гатовыя да таго, каб супрацьстаяць гэтай лавіне фэйкаў», — адзначыў старшыня БСЖ.

Па выніках форуму дэлегаты з'езда прынялі дэкларацыю, у якой заклікалі калег процідзейнічаць спробам фальсіфікацыі гісторыі, тыражыравання варожасці і экстрэмізму ў медыяпрасторы. Пацвярджаючы асноўныя прынцыпы салідарнасці і карпаратыўнай самаарганізацыі журналісцкай супольнасці, члены БСЖ абавязваюцца супрацьстаяць усімі даступнымі законнымі метадамі мэтанакіраваным кампаніям і асобным фактам ціску, запалохвання, булінгу і цкавання ў адносінах да калег.

**Паводле БелТА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Падчас з'езду таксама ўручылі творчыя ўзнагароды. Лаўрэатам рэспубліканскага творчага конкурсу «Залатое пяро» ў намінацыі «За лепшую работу ў мастацка-публіцыстычных жанрах» стала наша калега, журналіст газеты «Літаратура і мастацтва» Наталля СВЯТЛОВА. Віншуем і жадаем новых поспехаў!*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША замарозілі вывад войскаў з Афганістана



Злучаныя Штаты пацвердзілі, што вывад войскаў замарожаны да 15 студзеня, завяршэнне місіі залежыць ад вынікаў перагавораў з радыкальным рухам «Талібан». Аб гэтым заявіла кіраўнік Мінабароны ФРГ Анегрэт Крамп-Карэнбаўэр. «Колькасць кантынгенту ў дзве з палавай тысячы захоўваецца, гэта важна для далейшага планавання. У наступныя дні амерыканцы павінны заявіць канкрэтна, каго і дзе яны выводзяць і што гэта значыць для нас у кароткатэрміновай перспектыве», — сказала міністр, выступаючы на форуме па знешняй палітыцы, арганізаваным фондам Кербера ў Берліне. Яна падкрэсліла, што «дачасны, дэструктыўны вывад войскаў ЗША і, магчыма, пасля гэтага войскаў НАТА» не дасць «часу, які неабходны, каб весці гэтыя складаныя перагаворы».

### Кітайскі зонд рушыў на Месяц

Паспяхова стартавала кітайская цяжкая ракета-носьбіт «Чанчжэн-5» з вяртаемым апаратам «Чан'э-5», які павінен здзейсніць пасадку на Месяц, сабраць узоры месяцавага грунту і вярнуцца з імі на Зямлю, паведаміла РІА «Навіны». Пуск адбыўся з касмадрома «Вэньчан» на востраве Хайнань. Зонд выканаў сваю першую арбітальную карэкцыю, паведаміла Кітайскае нацыянальнае касмічнае ўпраўленне (CNSA). У выпадку поспеху «Чан'э-5» стане першай з канца 1970-х гадоў місіяй па дастаўцы рэгаліту на Зямлю. Раней гэта ўдавалася зрабіць толькі СССР і ЗША. Праграма зандзіравання Месяца «Чан'э» (названая так у гонар кітайскай багіні Месяца) уключае ў сябе тры этапы: аблёт вакол спадарожніка Зямлі («Чан'э-1» і «Чан'э-2»), пасадка на Месяц («Чан'э-3» і «Чан'э-4») і вяртанне з Месяца на Зямлю («Чан'э-5» і «Чан'э-6»). Першы і другі этапы праграмы ўжо паспяхова завершаны. Цяпер рэалізуецца трэці этап. Місія «Чан'э-7» мае на мэце агульнае даследаванне Паўднёвага полюса Месяца, у тым ліку комплекснае зандзіраванне месяцавага рэльефу. «Чан'э-8», акрамя навуковых даследаванняў, павінен правесці на месяцавай паверхні ключавыя выпрабаванні шэрагу тэхналогій.



### Kaspersky назвала галоўныя кіберпагрозы

Пранікненне ў сеткі арганізацый, палітычны кібершпіянаж, атакі праз тэхналогіі 5G і кіберкампаніі на тэму пандэміі будуць сярод галоўных кіберпагроз 2021-га. Такія трэнды вызначаны ў прагнозе даследчага цэнтра GReAT «Лабараторыі Касперскага». Адным з ключавых і найбольш небяспечных трэндаў эксперты лічаць куплю ў іншых зламыснікаў групамі, якія рыхтуюцца таргеціраваць кібератакі (APT-групы), рэсурсаў для першаснага пранікнення ў сетку. «Эксперты мяркуюць, што атакуючыя прагнуць ужываць такія схемы пры правядзенні складаных мэтавых кампаній. Урады розных краін усё часцей будуць гучна заяўляць пра дачыненне канкрэтнай групы да той ці іншай атакі. Раскрыццё інфармацыі пра кіберзброю праз афіцыйныя каналы ўрадавых арганізацый дазволіць больш актыўна змагацца з кампаніямі кібершпіянажу, паколькі рассакрэчаныя інструменты выкарыстоўваць складаней», — лічаць эксперты. Акрамя таго, вырасце колькасць мэтавых нападаў на сеткавыя прылады, такія як VPN-шлюзы, — зламыснікі будуць збіраць уліковыя даныя карыстальнікаў з дапамогай метадаў сацыяльнай інжынерыі, напрыклад вішынгу.

# СЛУЖЭННЕ ЛЮДЗЯМ І КРАІНЕ

**Сёлета VI Беларускія Калядныя чытанні «Гістарычная памяць народа: 550-годдзе з'яўлення Жыровіцкай іконы Божай Маці, 500-годдзе Жыровіцкага манастыра, 800-годдзе святога дабравернага князя Аляксандра Неўскага» пройдуць 26—27 лістапада ў новым анлайн-фармаце.**

Урачыстае адкрыццё мерапрыемства і пленарнае пасяджэнне адбудзецца сёння ў дыстанцыйным фармаце ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. А работа секцый будзе праводзіцца 26—27 лістапада ў такім жа выглядзе ў вышэйшых навучальных установах горада Мінска.

— Калядныя чытанні — гэта адзін з найбуйнейшых форумаў, якія праводзіць Беларуская праваслаўная царква ў сферы сацыяльнага служэння. У рамках яго мы збіраем вопыт служэння ў розных сферах, напрыклад, сацыяльнай, педагагічнай і іншых, каб падвесці своеасаблівыя вынікі, — адзначыў **намеснік старшыні Сінадальнага аддзела рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі Праваслаўнай царквы іерэй Дзмітрый ВОРСА.** — Дадзенае мерапрыемства ўжо стала традыцыйным і яно мае кожны год сваю тэматычную накіраванасць. Сёлета мы вызначылі яе як памяць народа, таму што на гэты год выпала святкаванне некалькіх дат, звязаных з праваслаўем. Адкрыццё форуму адбудзецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, якая з'яўляецца нашай традыцыйнай пляцоўкай. Таксама пройдуць разнастайныя тэматычныя мерапрыемствы, работа секцый, круглых сталоў рознай тэматыкі. Трансляцыя ўсіх падзей будзе адбывацца праз YouTube-каналы, Zoom-платформу. Геаграфічна форум ахопіць як Беларусь, так і рэгіёны Расіі, бо гэтаму спрыяе дыстанцыйны фармат яго правядзення.

Праграма чытанняў прадугледжвае работу па многіх кірунках, дзе не абмінуць увагай сацыяльнае служэнне царквы, адраджэнне хрысціянскіх сямейных каштоўнасцяў, духоўнае адраджэнне праз дзейнасць бібліятэк, узаемадзеянне царквы і моладзі, дзейнасць у сферы інклюзіі і многія іншыя. Пройдзе педагагічная канферэнцыя «Традыцыйныя духоўна-маральныя каштоўнасці і сучасная адукацыя», адбудуцца V Мінскія казачныя Калядныя адукацыйныя чытанні. Падвядуць тут вынікі конкурсу дзіцячых малюнкаў «Прыгажосць Божага свету». Падрыхтавалі таксама і выстаўку, на якой можна азнаёміцца з новымі выданнямі, сумеснымі праектамі.

— Сёлета, рыхтуючыся да чытанняў, мы звярнуліся да адной вельмі далікатнай і вострай тэмы, і наш семінар назвалі «Псіхалагічныя асаблівасці перажывання чалавекам страты. Настаўленне для людзей прафесій, якія дапамагаюць», — анансаваў напрамак работы адной з секцый протаіерэй **Павел СЯРДЗЮК, старшыня Сінадальнай камісіі па пытаннях сям'і, мацярынства і дзяцінства Беларускай праваслаўнай царквы.** — Царква заўсёды стаіць на абароне чалавечай годнасці. І здзяйсняючы служэнне ў сферы сям'і, мацярынства і дзяцінства і таксама звяртаючы ўвагу на перынатальныя страты, якія зараз шырока распаўсюджаны ў нашым грамадстве, мы з дапамогай вядучага псіхолага вырашылі разгледзець гэтую тэму.

Ён таксама адзначыў, што ў рамках работы секцыі «Адраджэнне хрысціянскіх сямейных каштоўнасцяў» будзе разгледжана шмат цікавых і актуальных пытанняў і тэм, якія варта сёння выносіць на абмеркаванне грамадства. Гэта аборты, скасаванне шлюбаў, традыцыі сучаснай сям'і і многія іншыя.

Дарэчы, адна з вострых тэм сённяшняга часу — гэта валанцёрская дапамога медыкам ва ўмовах эпідэміялагічнай сітуацыі. **Старшыня Сінадальнага аддзела па царкоўнай дабрачыннасці і сацыяльным служэнні протаіерэй Кірыл ШОЛКАЎ** адзначыў: «З першай хваляй эпідэміі мы неяк справіліся. На мой погляд, грамадства скансалідавалася. А вось другая хваля, і я не закранаю зараз палітыку, паказала нам вялікія праблемы, што цяпер медыкам мала хто дапамагае. Я з гэтым сутыкнуўся на асабістым вопыце. І гэты момант мяне сапраўды непакоіць. Няхай і не вельмі цяпер атрымліваецца, але мы павінны жыць далей і дапамагаць, падтрымліваць адзін аднаго. І я хачу на нашым форуме абмеркаваць гэтыя пытанні».

**Алена ДРАПКО.**

# «ЗІМОВЫ ЦЮНІНГ ДЛЯ МАШЫН — ПРАВІЛЬНЫ ПРАТЭКТАР ШЫН»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Бруй дадаў, што з надыходам зімы, калі выпадае снег, хуткасць патоку таксама падае. Адказныя кіроўцы рыхтуюць свае аўтамабілі да зімы, мяняюць манеру язды — зніжаюць хуткасць, пазбягаюць лішніх перастраенняў. Але, на жаль, «дзень бляхара» гэта не адмяняе. Пры гэтым адзначаецца рост дробных дарожных здарэнняў, у якіх пакутуюць толькі аўтамабілі. У той жа час сур'ёзна зніжаецца колькасць ДТЗ, у якіх церпяць людзі. Але зноў жа гэта ўсё актуальна ў пэўныя дні.

## ПЛАН «НАДВОР'Е» І НУМАР 125

**Старшы інспектар па асобых даручэннях аддзела арганізацыі дарожнага руху і дарожнай інспекцыі ДАІ МУС Вадзім ФІЛОНЧЫК** адзначыў, што перад пачаткам зімовага сезона ажыццяўляецца маніторынг гатоўнасці арганізацый камунальнай гаспадаркі да работы ў складаны перыяд. У гэты час вывучаюцца пытанні аднаўлення дарожнага пакрыцця, правяраецца нарыхтоўка процігалалёдных матэрыялаў, гатоўнасць дарожнай тэхнікі, устаноўка папераджальных дарожных знакаў і іншыя.

У цэлым, работа арганізацый дарожна-камунальнай гаспадаркі па падрыхтоўцы да зімовага сезона выканана. У тэрытарыяльных падраздзяленнях ДАІ штогод распрацоўваецца комплекс неадкладных мерапрыемстваў і дзеянняў у складаных умовах надвор'я (План «Надвор'е»). Вызначаны супрацоўнікі, якія адказваюць за канкрэтныя ўчасткі аўтамабільных дарог, кантактныя тэлефоны дыспетчарскіх службаў.



Прадстаўнік аўтаінспекцыі заявіў, што ў выпадках узнікнення непрадбачаных абставін, звязаных з пагаршэннем дарожнага пакрыцця, якія павышаюць аварыйнасць, рэкамендуецца паведамляць інфармацыю па нумарах тэлефонаў 125 альбо 102. Спецыяльныя службы аператыўна рэагуюць на інфармацыю, якая паступае ад удзельнікаў дарожнага руху, і прымаюць неабходныя меры.

Ён, у прыватнасці, адзначыў, што колькасць дарожна-транспартных здарэнняў з прычыны няспраўнасці аўтамабіляў невысокая. Тым не менш наяўнасць зімовых шын і іх стан у зімовы перыяд правяраецца з асаблівай увагай падчас тэхагляду. Там жа правяраецца і работа шклоачышчальнікаў і шклоамывальнікаў, працаздольнасць якіх зімой мае важнае значэнне для бяспекі.

## ТЭХНІКА, ПЯСОК І СОЛЬ

Міністэрствам транспарту і камунікацый распрацаваны комплекс арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы аўтамабільных дарог і арганізацый да работы ў асенне-зімовы перыяд. Пра гэта паведаміў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аўтадарог Міністэрства транспарту і камунікацый Рыгор ГЛАЗКО.**

У кожнай эксплуатацыйнай арганізацыі рэспубліканскіх аўтамабільных дарог праведзена адпаведная інжынерная падрыхтоўка. У прыватнасці, падрыхтавана і запланавана работа 60 адзінак ротарнай тэхнікі, 653 адзінак пясчана-размеркавальнай тэхнікі, 945 адзінак снегаачышчальнай тэхнікі, у тым ліку 150 аўтагрэйдараў і 592 трактары. Для якаснай работы ў асенне-зімовы перыяд штогод арганізацыі міністэрства нарыхтоўваюць 387 тысяч тон пясчана-салявой сумесі, 182 тысячы тон тэхнічнай солі, 186 тысяч тон чыстай солі.

## ВЫВАЗ СНЕГУ Ў МІНСКУ — НА 9 ПЛЯЦОВАК

**Намеснік гендырэктара ДВА «Гаррамаўтадар» Мінгарвыканкама Уладзімір ЛАТУШКІН** упэўнены ў тым, што ўсе гарадскія службы, якія забяспечваюць якасны стан вулічна-дарожнай сеткі горада Мінска ў зімовы перыяд, знаходзяцца ў рабочым стане. Тэхніка ў колькасці 763 адзінак падрыхтавана да работы ў поўным аб'ёме: праведзена тэхабслугоўванне і атэстацыя на нормы размеркавання.

Таксама заключаныя дагаворы з іншымі арганізацыямі на выкарыстанне спецтэхнікі, у прыватнасці на вываз снегу. Вываз снегу ў Мінску будзе ажыццяўляцца на 9 асноўных і рэзервовых пляцоўках. Таксама будзе ажыццяўляцца ўтылізацыя снегу на снегаплавільным пункце. Па стане на 20 лістапада ў Мінску нарыхтавана 32 тысячы тон пясчана-салявых сумесяў (60 % ад агульнай патрэбы). Увогуле на зіму Мінску патрэбна 48,5 тысячы тон чыстай солі і 54 тысячы тон пясчана-салявой сумесі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Разумныя грошы

# Каштоўныя паперы і ў валюце маюць вагу

**Беларусбанк з трэцяй дэкады лістапада аказвае паслугі кліентам па куплі карпаратыўных аблігацый адной лізінгавай кампаніі 1-га і 2-га выпускаў, намінаваных у беларускіх рублях і доларах адпаведна.**

Працэнтная стаўка па аблігацыях фіксаваная і роўная 14 % гадавых у беларускіх рублях і 8,5 % гадавых у доларах. Тэрмін абарачэння аблігацый — два гады.

Нагадаем, падраздзяленне ААБ прапануе нам набыць мноства аблігацый, як той казаў, на розны густ і кашалёк. У чым жа тады перавага названых аблігацый? Справа ў тым, што Беларусбанк ажыццяўляе брокерскае абслугоўванне кліентаў па набыцці аблігацый гэтых выпускаў без камісій. Цяпер каштоўныя паперы гэтай кампаніі можна купіць як непасрэдна ў аддзяленнях банка, так і праз сістэму «Інтэрнэт-банкінг» дадзенага фінансавага інстытута.

Цяпер разгледзім гэтыя аблігацыі больш падрабязна. Аблігацыі ў беларускіх рублях пад 14 % гадавых, з выплатай дывідэндаў — адзін раз на тры месяцы. Аблігацыя мае намінал тысяча рублёў. Аб'ём эмісіі складае 500 тысяч рублёў, гэта значыць, у продажы 500 аблігацый. Рублёвыя аблігацыі маюць невялікую прыбытковасць у параўнанні з кароткатэрміновымі ўкладамі. На кароткатэрміновых дэпазітах сёння можна зарабіць значна больш (у некаторых банках існуюць уклады пад 18,5 % гадавых), праўда лінейка такіх укладаў, як правіла, абмежаваная паўгадавым тэрмінам. Тут жа тэрмін абарачэння два гады. Калі кліенты прыслухоўваюцца да прагнозаў Нацбанка наконт узроўню інфляцыі ў наступным годзе, то 14 % гадавых у рублях будзе адпавядаць 8–9 % гадавых у валюце.

У выпадку калі спажывец не жадае рызыкаваць (укладаць свае зберажэнні на працяглы тэрмін у нацыянальнай валюце), існуе альтэрнатыва — аблігацыі ў доларах. Гэтыя аблігацыі другога выпуску маюць даходнасць 8,5 % гадавых і намінал 500 долараў. Аб'ём эмісіі складае 500 тысяч долараў, гэта значыць, маем у продажы 1000 аблігацый, але...

Як вядома, доларавыя аблігацыі цяпер толькі апасродкавана з'яўляюцца такімі. Валюта куплі і пагашэння аблігацый — беларускія рублі па курсе Нацбанка на дату здзяйснення здзелкі. Інакш кажучы, наша аблігацыя не мяняецца на рэальныя долары, а толькі «прывязана» да гэтай замежнай валюты.

Заўважу, што рэжым брокерскага абслугоўвання пры куплі аблігацый ў аддзяленні банка — «сёння на заўтра» (здзелка здзяйсняецца на наступны рабочы дзень пасля дня прыёму дакументаў ад кліента). Купля аблігацый праз сістэму «Інтэрнэт-банкінг» ажыццяўляецца ў рэжыме рэальнага часу — імгненна.

Для тых кліентаў, каму грошы спатрэбяцца бліжэй, чым праз два гады, распрацаваны механізм датэрміновага выкупу. Такі выкуп аблігацый ажыццяўляецца на біржы з выкарыстаннем уладальнікамі аблігацый паслуг Беларусбанка як упаўнаважанага брокера. Датэрміновы выкуп аблігацый ажыццяўляецца па бягучым кошце аблігацый на дату датэрміновага выкупу ў беларускіх рублях па курсе Нацыянальнага банка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Сацыяльны вектар

# Не менш як 4 тысячы

Да канца года на паляпшэнне жыллёвых умоў у сталіцы накіруюць 1,6 тысячы шматдзетных сем'яў

**Пра гэта паведаміла начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Алена ЛУКАШЭВІЧ падчас аператыўнай нарады ў Мінскім гарвыканкаме. У прыватнасці, яна заявіла, што ў Мінску у чарзе на жыллё знаходзяцца 6,3 тысячы шматдзетных. З пачатку года на паляпшэнне жыллёвых умоў ужо накіравана 2,4 тысячы такіх сем'яў, а яшчэ 1,6 тысячы атрымаюць накіраванне да канца года.**

Начальнік упраўлення дадала, што для гэтых мэт адміністрацыям раёнаў выдзелена 1 536 кватэр у 15 аб'ектах будаўніцтва, у тым ліку ў двух дамах у Смалявічах. Для іх размеркавання паміж тымі, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, цяпер праводзіцца збор заяў. Толькі за мінулую дэкаду месяца ўжо выдзелена больш за 300 кватэр. Да канца года адміністрацыям раёнаў будзе выдзелена яшчэ 11 аб'ектаў будаўніцтва на 1629 кватэр.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Дзеля памяці

## ЗАЦЯРУШАНАЯ СЦЕЖКА

Памёр Дзмітрый Пятровіч — пісьменнік, выдатны знаўца роднай беларускай мовы. У мінулыя гады ён



працаваў у рэдакцыі газеты «Звязда». Чытачы ў той час мелі магчымасць пазнаёміцца з яго вершамі, прозай. Больш за тое, кожны нумар выдання выходзіў пасля таго, як матэрыялы газеты пабывалі на яго рабочым стале — ён працаваў стыльрэдактарам, усе свае веды і багаты вопыт прысвячаў беларускай мове. Шырока вядомы яго паэтычны зборнік «Святло адвечнай песні» ўганараваны Нацыянальнай літаратурнай прэміяй у 2019 годзе.

Мы былі сябрамі. Разам неаднойчы хадзілі сцежкамі бліз Купалавай хаты ў Вязынцы. На адной з такіх сцежак некалькі дзён таму я зрабіў гэта фота. Падаў першы снег.



*Ні хмары чорныя, ні белыя аблокі*
*Не назаўжды над хатаю*
*тваёй —*
*Іх унясуць бураны ў край далёкі,*
*Пакінуць толькі сонца ды спакой.*
*І кветка майская,*
*і жоўты ліст асенні*
*Сплывуць ў нябыт*
*па вечнай плыні дзён,*
*І год за годам прамільгнуць*
*іменнем —*
*Не спыняць іх ні слава,*
*ні праклён.*
*Але, мінае ўсё,*
*каб зноў вярнуцца,*
*І там, дзе сёння жоўты ліст*
*ляжыць,*
*Вясновым ранкам*
*парасткі прачнуцца,*
*Ў святле адвечнай песні*
*будуць жыць.*

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

**«Звяздоўцы» выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім Дзмітрыя Леанідавіча.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім з нагоды заўчаснай смерці Пятровіча Дзмітрыя Леанідавіча, намесніка дырэктара выдавецкага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мастацкая літаратура».**

# Зімовы асартымент





*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Ядомыя» прыкметы зімы ў наш час — мандарыны, апельсіны, хурма, гранаты. І, вядома ж, саленні — «карэйскія салаты» (на якія ўзрастае попыт з надыходам халадоў) і нашы родныя «бочкавыя» салёныя агурочкі, чарамша, марынаваны часнок. Мы адправіліся на прадуктовыя рады сталічнага рынку «Лебядзіны», каб пагутарыць з прадаўцамі і даведацца пра цэны на «зімовы» асартымент.

## АРАНЖАВЫ НАСТРОЙ

*Апельсіны* — традыцыйная для айчыннага спажыўца «зімовая» садавіна. Цяпер якраз «апельсінавы» сезон там, дзе гэтыя цытрусы растуць, так што смела купляйце — іх долькі сапраўды будуць сакавітыя і смачныя. Апельсіны да нас прывозяць з Турцыі, Іспаніі, Егіпта, Марока, Паўднёвай Афрыкі, Кітая.

Дарэчы, нядаўна саспелі іспанскія апельсіны — там іх збіраюць з канца лістапада, і турэцкія — сезон пачынаецца з кастрычніка. Егіпецкія плады падвязуць крыху пазней — там «апельсінавы ўраджай» збіраюць з канца снежня. Усяго сартоў апельсінаў каля чатырох сотняў, але ў прамысловых маштабах вырошчваецца толькі некалькі дзясяткаў. Так што жыхары паўночных краін могуць пакаштаваць толькі невялікі «кавалачак» з усёй разнастайнасці. У краінах, дзе апельсіны растуць пад вокнамі, у ежу ўжываецца не толькі мякаць, але і лупіны — з іх гатуюць цукаты, мармелад і варэнне. У нас апельсінавая цэдра ўспрымаецца хіба што ў кантэксце глінтвейну. Цэны на апельсіны зараз — у сярэднім 4.50 рубля за кілаграм.

***Мандарыны*** — яшчэ савецкі сімвал Новага года — ужо ў продажы: у асноўным турэцкія (салодкія), можна знайсці таксама абхазскія (кісла-салодкія, без костачак) і італьянскія — далікатныя, сакавітыя, амаль без плёнак і без костачак. Ідэальна, каб парадаваць дзетак. Яшчэ ёсць клемянціны — не блытаць з мандарынамі (хоць звычайна ўсё ж блытаюць). Гэта «помесь» мандарына з апельсінам-каральком. У іх больш шчыльная скурка, чым у мандарынаў, яны крыху больш складана чысцяцца. Афарбоўка цэдры ў клемянцінаў ярчэйшая, чым у мандарынаў. Цэны на мандарыны вар'іруюцца ад 4.50 да 6.50 за кілаграм. Італьянскія мандарыны на «Лебядзіным» прадаюць па 7.50 за кіло.

***Лімоны*** — куды без іх у сезон вірусных захворванняў? Любімы народны рэцэпт — чай, лімон, мёд («і любую прастуду як рукой здыме») — мабыць, карыстаецца папулярнасцю: на маіх вачах дзяўчына купіла цэлы кілаграм. Звычайна лімоны купляюць па 1—2 штучкі (галоўнае — не забыцца!), але апошнім часам, кажа прадаўшчыца, бяруць адразу паўкілаграма-кілаграм, як апельсіны.

У гэтую пару года асноўны пастаўшчык лімонаў на нашы рынкі — Турцыя. Кошт за кілаграм — у сярэднім 4.50. Медыкі раяць выбіраць тыя, у якіх тоўстая лупіна: вітамін С, як вядома, вельмі няўстойлівы, і пад тоўстай «скурай» яго будзе больш. Хоць, як распавядаюць прадаўцы, нашы людзі аддаюць перавагу сакавітым лімонам з тоненькай цэдрай. Зялёныя грэйпфруты — таксама скарбніца вітаміну С плюс калію для ўмацавання сасудзістай сценкі — абыдуцца даражэй: па 10 рублёў за кг.

***Хурма*** — яшчэ адзін зімовы фрукт. Наогул ён на аматара — не карыстаецца такой усенароднай любоўю, як мандарыны ці апельсіны. Але купляюць і яе досыць актыўна. На рынку хурма ўжо з кастрычніка — Бычынае сэрца, Какі, Каралёк мядовая. Цэны дэмакратычныя — ад чатырох рублёў за кілаграм. Іспанская хурма даражэйшая — 7.50 рубля за кіло. Затое яна не вяжа і без костачак.

## ГРАНАТЫ І БАХЧА

Сезон гранатаў у разгары, так што і тут не памылішся — плады ў дзевяці выпадках з дзесяці будуць спелыя. Родам гранаты — тыя, што прадаюць на адкрытых радах на «Лебядзіным», — з Азербайджана. Колер лупіны залежыць ад сорта (а іх сотні), і пад бледна-ружовай «скурай» могуць хавацца «зярняткі» больш сакавітыя і салодкія, чым пад цёмнай. Выбіраць гранат трэба не па колеры скуркі.

— Недаспелы гранат можна адрозніць па паху, — тлумачыць прадаўшчыца. — І па вазе: саспелы гранат заўсёды цяжкі. А яшчэ па ім можна пастукаць, як па кавуне: гук павінен быць звонкі. Калі гук глухі, зерне ўнутры будзе кіслае. Асабіста я выбіраю так: прыгожы, бліскучы, круглы — дакладна няспелы. Лупіна павінна быць шурпатая, а сам гранат — як бы «рабрысты»: гэта спелыя зярняткі распіраюць яго знутры. І бярыце вялікія гранаты: чым меншы плод, тым драбнейшыя зярняткі.

***Гранаты*** абыдуцца ў сярэднім па 6 рублёў за кг. А вось адносна танны вінаград з Малдовы, Арменіі і Азербайджана ўжо заканчваецца. Яшчэ пару тыдняў, і ён падаражэе. Пакуль яго кошт — ад 4 рублёў за кілаграм, у сярэднім па 5; кішміш прадаюць па 6 рублёў за кіло.

Заканчваюцца і ***дыні.*** Іх сезон хуткацечны, і тое, што на прылаўках, — ужо рэшткі. Пакуль мядовыя ўзбекскія «тарпеды» — па 3.50 за кілаграм.

Сезон кавуноў раней заканчваўся ў верасні, а ў нашы дні імі актыўна гандлююць і ў канцы лістапада. Праўда, і ***кавуны*** ўжо таксама апошнія. Іх прададуць вам па рубель 60 капеек за кілаграм: «Танней, чым на Камароўцы!», рэкламуе мне свой тавар прадавец.

— Нешта яны так сабе...

— Ну, так. Гэта ж рэшткі, — флегматычна згаджаецца дзядзечка і прапануе яшчэ трохі скінуць цану.

Кавуны ў асноўным вялікія, так што адзін «паласацік» будзе каштаваць 7-8-10 рублёў.



## «ЯГАДКА ЗНОЎ» І ДАРАГІЯ ПАМІДОРЫ

Ягадны сезон скончыўся даўно, але восеньскія ягады на «Лебядзіным» ёсць — не танна, але для здароўя, напэўна, не шкада. Прадаўцы кажуць, што людзі купляюць. ***Журавіны*** каштуюць 10 рублёў за кілаграм, ***садовыя буякі*** — ад 6 да 8 рублёў у залежнасці ад таварнага выгляду. Экзатычныя ягады ***фейхоа*** — ад 6 да 6.50 за кілаграм. Якраз цяпер на Каўказе збіраюць іх ураджай.

— Купляе хто-небудзь фейхоа?

— Хто ведае — купляе, — кажа дзяўчына за прылаўкам. — Варэнне можна варыць, а лепш — здрабніць і проста есці з цукрам. Ці з мёдам.

Акрамя высокага ўтрымання вітаміну С, фейхоа не саступае морапрадуктам па колькасці ёду. Так што для беларусаў гэтыя ягады выключна карысныя.

***Памідоры і агуркі*** — ужо раскоша. Яшчэ можна знайсці па 4.50-4.90, але ў цэлым цэны кусаюцца. «Самыя смачныя жоўтыя таматы» — па 5.50. Буйныя цёмна-малінавыя азербайджанскія — тры штукі на кілаграм — па 10, крыху меншыя — па 7, далей — па 6 і па 5 рублёў за кіло («Вось гэтыя, дробненькія, па пяць — вельмі смачныя, праўду вам кажу!»). «Салодкія, ташкенцкія» — проста «залатыя»: аж па 30 рублёў за кілаграм (можна пахадзіць па рынку і знайсці за 25, калі ўжо вы такі гурман). Прыгожанькія пінскія агурочкі — даражэйшыя за заморскія ківі, па 6 рублёў за кілаграм. Што зробіш — не сезон. Затое рэпчатая ***цыбуля*** — кожнаму па кішэні, фіялетавая па паўтара рубля, жоўценькая — па 90 капеек за кіло. ***Часнок*** традыцыйна дарагі — амаль па 8 рублёў (дакладней, сем з капейкамі). Затое танны ***дайкон*** — па рублі за кілаграм (той, што буйнейшы, — па паўтара). Кітайскі караняплод, што выдатна прыжыўся ў беларускай зямлі, сёння ў модзе ў аматараў правільнага харчавання. Лічыцца, што ён умацоўвае імунітэт і падтрымлівае сэрца. Ядуць яго ў салатах — са смятанай або алеем. А яшчэ на «Лебядзіным» — вялікі выбар яблыкаў. ***Яблыкі*** нашы, беларускія, у асноўным брэсцкія (хоць ёсць і гродзенскія), па 3-3.50 рубля за кілаграм.

## САЛАТЫ І МАРЫНАДЫ

Салаты-марынады на «Жданах» (як часам называюць мінчане рынак «Лебядзіны») прадстаўлены не вельмі шырока — за гэтымі ласункамі мінчане звычайна ідуць на Камароўку. Але і тут можна знайсці таго-сяго вострага і салёнага. Прадаўцы ахвотна прапаноўваюць пакаштаваць свае салаты, нават калі ты проста падышоў паглядзець. Метад працуе: нежк сорамна нічога не купіць, калі ты ўжо пакаштаваў і тое, і другое, і трэцяе.

Цэны такія: ужо амаль родная ***«карэйская морква»*** — па 5 рублёў за кілаграм (і вострая, і сярэдняй вастрыні). Марынаваны кальмар з той жа морквай — па 4.50 за 100 г, чарамша — 2.50 за 100 г, ***салёныя агурочкі*** — 5 рублёў за кілаграм. Самыя дарагія крэветкі — 10 рублёў за 100 г. Ёсць яшчэ вадарасці розных колераў, марынаваныя кабачкі і часнок, спаржа, падсмажаныя і потым замарынаваныя баклажаны, а таксама марынаваныя памідоры, фаршыраваныя зелянінай (іх прадаюць ад пяці штучак).

З салёных і марынаваных грыбоў (усё ж восень!) — толькі шампіньёны і шыітаке. Салёных апенек-маслякоў, як на Камароўцы, на «Лебядзіным» заўважана не было. Затое ў якасці бонуса гэтай хмурнай халоднай раніцай буднага дня — усмешлівая добразычлівая прадаўшчыца бясплатна накладвае кожнаму пакупніку ў пакецік 200 грамаў капусты «Правансаль». Такая вось «акцыя» — проста каб настрой у людзей стаў лепшы. Ну і, вядома, каб пакупнікі вярталіся.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

**Фота аўтара.**

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

26 ЛІСТАПАДА 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 21 (15898)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года




*Маладыя імёны*

## Арына ПЕХЦЕРАВА:

# «Хачу стаць выдатнай прафесійнай артысткай»

**«Рухай свет!» — слоган 18-га дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2020», фінал якога адбудзецца 29 лістапада. Скіраваць яго ў бок таленту і пазітыву паспрабуе і 12-гадовая беларуска Арына Пехцерава. Ураджэнка Магілёва расказала «ЧЗ», як рыхтуецца прадставіць краіну на галоўным песенным конкурсе кантынента. Спойлер — дзяўчыне ўсё падабаецца.**

### СЦЭНА ВЫБРАЛА ЯЕ

Падрыхтоўка да дзіцячага «Еўрабачання» выйшла на фінішную прамую. Песня «Прышэльцы» адрэпеціраваная да дасканаласці, спявачка настроена рашуча. Сёлета ў сувязі са складанай эпідэміялагічнай сітуацыяй у свеце ўпершыню ў гісторыі конкурс пройдзе анлайн. Кожны нумар загадзя запісаны ў студыі нацыянальнай тэлекампаніі і будзе прадстаўлены публіцы 29 лістапада. Выступленне Арыны запісалі ў легендарнай 600-метровай студыі Белтэлерадыёкампаніі. «Ужо не церпіцца паказаць яго ўсім. Але пакуль не буду раскрываць усіх сакрэтаў, толькі скажу, што ён абавязкова спадабаецца гледачам і маім прыхільнікам. Я вельмі на гэта спадзяюся», — суразмоўніца захоўвае галоўную інтрыгу.

Нягледзячы на новы фармат, які не дазволіць канкурсантам пазнаёміцца ўжывую, яны паспелі пасябраваць. І зараз актыўна падтрымліваюць адзін аднаго ў інтэрнэце, перапісваюцца, ладзяць прамыя эфіры. Да гэтай сітуацыі дзяўчына адносіцца па-даросламу — здароўе важнейшае за ўсё. Але прызнаецца, што крыху крыўдна не паехаць у Польшчу і не выйсці на сцэну «Еўрабачання».

Не Арына выбрала сцэну, а сцэна — яе. А як можа быць інакш у чалавека, які вырас у творчай сям'і музыкантаў? Мама іграе на фартэпіяна, старэйшая сястра Інара калісьці спявала. Ген творчасці дзяўчынка атрымала і ад прадзеда — вядомага беларускага паэта Івана Пехцерава. «Я хадзіла ў вельмі творчы дзіцячы садок і была ўдзельніцай усіх свят. Калі ў першым класе прыйшла на праслухоўванне да свайго педагога Таццяны Галіноўскай, тая сказала мне, што я «зорка». Яна набірала дзяцей толькі з пятага класа, але мяне, першакласніцу, ужо не адпусціла. З той пары не разлучаюся ні са сцэнай, ні з Таццянай Мікалаеўнай. Мне пашанцавала, што пачала спяваць так рана — у дзяцей няма страху сцэны. Таму я хутка да гэтага прывыкла, і цяпер перад выступленнем адчуваю толькі лёгкае хваляванне, якое нават карыснае для артыстаў», — расказвае пра пачатак свайго творчага шляху Арына. За шэсць гадоў на сцэне дзяўчынка паспела зрабіць выдатную кар'еру.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*На хвалі гумару*

# ПРОФІЛЬ ЖАРТАЎ І ЗАБАЎ,

## або Рассмяшыць за 10—15 секундаў

**Максім ДОЛІНАЎ — папулярны блогер з Гомеля, які не любіць сумаваць або сядзець без справы: ён штодзень стварае цікавы гумарыстычны (і не толькі) кантэнт. У яго профілі ў TikTok — 1,9 мільёна падпісчыкаў, Likee — больш за 2 мільёны, Instagram — 447 тысяч, YouTube — каля 65 тысяч. Цяпер дваццацітрохгадовы юнак жыве ў Мінску, займаецца любімай справай і спыняцца не збіраецца: у галаве хлопца — безліч ідэй.**

— Нядаўна пачаў развівацца і ў музычнай сферы, у канцы верасня выйшла мая першая песня «Мама, я не такі», а ў лістападзе другая — «Закружылася». Ужо бачу шмат пазітыўных каментарыяў, і гэта вельмі прыемна. Увогуле па спецыяльнасці я эканаміст-менеджар, скончыў Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога. Актыўна весці профілі ў сацсетках пачаў тры гады таму з YouTube. Назіраў, як хутка развівалася гэтая платформа і рабіліся папулярнымі некаторыя блогеры. Падумаў: чаму б не паспрабаваць самому?

Максім са сваім сябрам стварылі ўласны канал. Загрузілі першае відэа, пасля — другое, трэцяе, аднак асаблівай аддачы ад аўдыторыі хлопцы не ўбачылі.

— За два гады ўдалося набраць толькі дзве тысячы падпісчыкаў — гэта мала. Там вялікая канкурэнцыя якаснага кантэнту і пэўны алгарытм пападання ў рэкамендацыі, магчыма, мы яго да канца не зразумелі. Таму акцэнтаваў сваю ўвагу на Instagram.



Спачатку атрымлівалася не вельмі добра, але з кожным разам станавілася ўсё лепш, аўдыторыя пачала расці. За паўтара года набраў больш за 400 тысяч падпісчыкаў, і зараз працягваю актыўна туды змяшчаць кантэнт. Праз некаторы час дабраўся і да TikTok (самай папулярнай сацсеткі ў свеце на сёння, для тых, хто не ў курсе). Я даўно ведаў пра яе. Шмат хто казаў, што там лёгка набраць аўдыторыю. Так выйшла і ў мяне — за чатыры месяцы ўбачыў свой першы мільён падпісчыкаў. Думаю, гэта дзякуючы таму, што многія ўжо ведалі мяне па Instagram і таму хутка падпісваліся. Цяпер аўдыторыя вырасла да 1,4 мільёна.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

*У цэнтры ўвагі*

# ЗНАЙСЦІ І ПАДТРЫМАЦЬ

## Усё пра стыпендыі, гранты і меры сацыяльнай абароны для маладых талентаў

**У першым паўгоддзі бягучага года банк даных адоранай моладзі папоўніўся інфармацыяй аб 639 грамадзянах. У яго ўключаюцца звесткі аб асобах, заахвочаных спецыяльным фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, пераможцах міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, конкурсаў і турніраў. На сённяшні дзень банк змяшчае звесткі пра 6180 чалавек: сярод іх 428 навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, 43 — устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, чатыры навучэнцы ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі, 1371 студэнт устаноў вышэйшай адукацыі, 108 магістрантаў і 236 аспірантаў.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



Фота з сайта тэлеканала АНТ.

# ЗНАЙСЦІ І ПАДТРЫМАЦЬ

## Шлях у навуку

— У Беларусі створана эфектыўная сістэма падтрымкі адораных маладых людзей, — падкрэслівае **начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА.** — Важным яе элементам з'яўляецца спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, дзякуючы якому тысячы чалавек атрымліваюць прызнанне сваіх дасягненняў на самым высокім дзяржаўным узроўні, што з'яўляецца добрым стымулам для далейшага развіцця іх інтэлектуальнага патэнцыялу.

За 24,5 года (у перыяд з 1996 года да ліпеня 2020 года) фонд прыняў рашэнні аб заахвочванні 38 716 навучэнцаў і студэнтаў, 3848 педагагічных і навуковых работнікаў, якія ўнеслі асаблівы ўклад у развіццё здольнасцяў таленавітай моладзі.

Стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прызначаныя 7003 студэнтам і курсантам, якія вучацца на 9—10 балаў і актыўна ўдзельнічаюць у навукова-даследчай дзейнасці ўстановы вышэйшай адукацыі.

Лаўрэатамі фонду за час яго дзейнасці сталі 1230 навучэнцаў, якія перамаглі ў міжнародных інтэлектуальных спаборніцтвах, з іх 402 студэнты і 828 навучэнцаў.

Штогод спецыяльным фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў аказваецца фінансавая падтрымка студэнцкім навукова-даследчым лабараторыям. За час яго дзейнасці 124 навуковыя лабараторыі змаглі абнавіць сваю навучальную і вытворчую базу, даследаваць і ўкараніць у практычнае выкарыстанне шэраг перадавых методык і распрацовак.

З мэтай актывізацыі навукова-даследчай работы штогод праводзіцца Рэспубліканскі конкурс навуковых работ студэнтаў. У апошнім прынялі ўдзел студэнты і выпускнікі 54 устаноў вышэйшай адукацыі і іх філіялаў. Усяго на рэспубліканскім этапе былі прадстаўлены 3904 работы.

Удзельнікі конкурсу маюць 6200 актаў укаранення, з іх 1756 актаў укаранення ў вытворчасць; 62 дакументы па ахове інтэлектуальнай уласнасці (патэнты, рацыяналізатарскія прапановы, заяўкі на выдачу патэнта).

Штогод Міністэрства адукацыі праводзіць конкурс на атрыманне грантаў для выканання навукова-даследчых работ дактарантамі, аспірантамі, саіскальнікамі і студэнтамі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, каб стымуляваць таленавітых маладых навукоўцаў.



Фота з сайта тэлеканала АНТ.

## Унікальныя магчымасці

Зараз у працэсе стварэння знаходзіцца Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк. Гэта якасна новая ўстанова адукацыі, скіраваная на выхаванне нацыянальнай інтэлектуальнай эліты. Яго галоўная мэта — рэалізацыя адукацыйных праграм, праграм дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, накіраваных на выяўленне і развіццё ў навучэнцаў здольнасцяў да навукова-даследчай работы, вынаходніцтва і рацыяналізатарства. Для адораных навучэнцаў у адным месцы будуць створаны ўмовы для вучобы, атрымання тэхнічных інавацыйных навыкаў, пражывання і спартыўна-культурнага адпачынку.

Як мяркуецца, штогод у дзіцячым тэхнапарку будзе вучыцца каля дзвюх тысяч найбольш адораных школьнікаў. Галоўныя кірункі — аэракасмічныя тэхналогіі, інфармацыйныя і камп'ютарныя тэхналогіі, лазерная тэхніка і тэхналогіі, біятэхналогіі, робататэхніка, «зялёная» хімія, нанатэхналогіі, энергетыка, машыны і рухавікі, інжынерная экалогія, архітэктурны і прамысловы дызайн.

Праграма для адораных дзяцей арыентавана на навучэнцаў 6—11 класаў, якіх будуць адбіраць па крытэрыях, устаноўленых Міністэрствам адукацыі. Адукацыйную праграму збіраюцца рэалізоўваць праз праектную дзейнасць, якая носіць міждысцыплінарны характар, з акцэнтам на практычны складнік. Па прыкладзе расійскага адукацыйнага цэнтра «Сірыус» у Сочы.

Навучанне ў тэхнапарку будзе праходзіць у групах ад 7 да 10 чалавек. Змена будзе доўжыцца ад 21 да 24 дзён з наступнай самастойнай работай навучэнцаў і яе суправаджэннем выкладчыкамі тэхнапарка з выкарыстаннем дыстанцыйных тэхналогій. У завочнай форме тэрмін навучання складае тры месяцы. Акрамя гэтага, у Дзіцячым тэхнапарку будуць арганізаваны кароткатэрміновыя азнаямленчыя праграмы, у тым ліку для дзяцей з рэгіёнаў.

Тэхнапарк уключае тры аб'екты: вучэбна-лабараторны корпус, інтэрнат і школу. Усе яны размесцяцца ў Першамайскім раёне сталіцы, на тэрыторыі паміж 15-м корпусам БНТУ і жылым комплексам «Магістр». Школа на 750 месцаў зможа абслугоўваць як дзяцей Першамайскага раёна, так і навучэнцаў тэхнапарка. Аб'ект ужо будуецца...

Мяркуецца, што ўжо ў студзені 2021 года ў эксперыментальным рэжыме пачнуць работу тры групы. Каардынатарам дзейнасці цэнтра выступае Рэспубліканскі цэнтр інавацыйнай творчасці дзяцей і моладзі.

## Важныя пазіцыі

— Падтрымка талентаў дзяржавай — найважнейшая тэма. Таму мы заўсёды задаём сабе пытанне, а ці ўсё было зроблена для таго, каб талент, дадзены маладому чалавеку Богам, рэалізаваўся? — падкрэслівае **старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Кацярына ДУЛАВА.** — Больш нідзе, акрамя мастацтва, няма такога працяглага прафесійнага станаўлення, таму што дзеці распачынаюць свой шлях у 4—5 гадоў. Для мяне вельмі важна ў гутарках з моладдзю звяртаць іх увагу на наступныя важныя пазіцыі. Па-першае, у Беларусі выбудавана стройная сістэма конкурсаў, фестываляў і іншых мерапрыемстваў, якія выхоўваюць і фарміруюць творчую асобу, даюць ёй магчымасць раскрыцца.

Па-другое, гэта меры сацыяльнай падтрымкі. Я часта ўдзельнічаю ў міжнародных форумах рэктараў творчых ВНУ і ведаю, якія пытанні стаяць на парадку дня ў іншых краінах: і з працаўладкаваннем маладых спецыялістаў, і з магчымасцю раскрыцця талентаў, і з грантавай падтрымкай. Пытанні для нас нечаканыя, бо мы ўсё гэта ўжо даўно маем. Пагадзіцеся, што магчымасць паступлення лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі на творчыя спецыяльнасці ў ВНУ без экзаменаў — вельмі сур'ёзная пазіцыя, бо гэта важны крок да атрымання прафесіі. Далей маладыя людзі, уключаныя ў банкі адоранай і таленавітай моладзі, маюць права на пазачарговае месца ў студэнцкім інтэрнаце, першачарговае размеркаванне пасля заканчэння вучобы.

А чаму мы саромеемся казаць пра меры фінансавай падтрымкі? Сумы ж, якія выдзяляюцца на гэтыя мэты, вельмі сур'ёзныя. Прэзідэнцкую стыпендыю можна параўнаць з заробатнай платай. Акрамя заахвочвальных прэмій і стыпендый за перамогі ў конкурсах існуюць яшчэ і гранты. Гэта цікавая форма атрымання сродкаў для рэалізацыі творчых ідэй. На мой погляд, за грантамі будучыня, таму што гэты спосаб дазваляе чалавеку ў поўнай меры раскрыцца і сфармуляваць свае мэты яшчэ на стадыі фарміравання задумы. Акрамя таго, гэта магчымасць падтрымкі вялікіх праектаў. Так, за кошт гранту спецыяльнага фонду Прэзідэнта праводзіліся такія маштабныя праекты, накіраваныя на рэалізацыю творчых маладзёжных ініцыятыў, як "Талент краіны", «Дакрананне», «Музычная спадчына Радзімы» і іншыя.

Яшчэ адна форма сацыяльнай абароны — устаноўленне надбаўкі да тарыфнай стаўкі (акладу) маладым спецыялістам з вышэйшай адукацыяй, уключаным у банкі даных адоранай і таленавітай моладзі ў перыяд навучання ва ўстановах вышэйшай адукацыі і прынятым на работу ў бюджэтныя арганізацыі. Таксама лаўрэаты фонду маюць права на атрыманне льготнага крэдыту на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылога памяшкання.

За ўвесь час існавання спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, заахвочванні атрымалі 4254 чалавекі і 319 калектываў. А самую вышэйшую ўзнагароду — гранд-прэмію — атрымалі 417 саіскальнікаў і 57 калектываў. Міністэрства культуры вядзе банк даных таленавітай моладзі. На сённяшні дзень ў яго ўнесены звесткі пра 672 чалавекі і 233 калектывы.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Нефармальная адукацыя

# ПРАСТОРА ДЛЯ ТВОРЧАГА ПЕДАГОГА

**У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце адбылося ўрачыстае адкрыццё сучаснай арт-прасторы BSPU HALL. Гэта пляцоўка для рэалізацыі творчых талентаў студэнтаў, якая складаецца з прасторнай актавай залы са сцэнай для выступленняў і рэпетыцый, грымёрных пакояў і гуказапіснай студыі. У адкрыцці BSPU HALL узялі ўдзел міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА і рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК.**





Фота прэс-службы БДПУ.

На думку міністра, развіццё творчых кампетэнцый для будучых педагогаў асабліва актуальнае. Для настаўніка вельмі важна ўмець размаўляць з аўдыторыяй і ўтрымліваць яе ўвагу. А заняткі ў творчых калектывах развіваюць у педагогаў неабходныя навыкі.

— Пазней, скончыўшы ўніверсітэт, прыйшоўшы ў прафесію, яны ўжо больш упэўнена адчуваюць сябе ва ўстанове адукацыі. Мы ўсе цудоўна ведаем, што сучаснага школьніка настаўнік цікавіць з усіх бакоў — не толькі з пазіцыі таго, наколькі добра той ведае свой прадмет. У першую чаргу ён цікавіць школьніка як асоба: што сабой уяўляе, што акрамя свайго прадмета яшчэ ведае, чаго дасягнуў у жыцці, якія ў яго ёсць дадатковыя ўменні і навыкі. І мне здаецца, што тая сістэма, якая выбудавана ў педагагічным універсітэце, як нельга лепш спрыяе шырокаму фарміраванню ў будучых настаўнікаў прафесійнай культуры. Упэўнены, што такі творчы педагог, які ў будучыні прыйдзе ў навучальную ўстанову, будзе там запатрабаваны, — падкрэсліў Ігар Карпенка.

Рэктар БДПУ Аляксандр Жук лічыць, што ў студэнтаў ёсць усе магчымасці, каб рэалізаваць свае таленты.

— Пры ўніверсітэце функцыяніруе каля 100 клубных аб'яднанняў, у якіх займаюцца 1800 студэнтаў. Трыццаць шэсць носяць званне народных, ёсць два студэнцкія тэатры — «Мы» і «Жывое слова». Для такой колькасці таленавітых студэнтаў, вядома, патрэбныя былі адпаведныя ўмовы. І мы паклапаціліся пра гэта. Рамонт правялі хутка, практычна за паўгода. І сёння маем залу з амфітэатрам на 150 пасадачных месцаў, грымёрныя пакоі. Абавязкова звярніце ўвагу на сцэны актавай залы. Да адкрыцця BSPU HALL мы рэстаўрыравалі трыпціх нашага выпускніка, вядомага мастака Андрэя Смаляка, які называецца «Студэнцкі тэатр».

Акрамя таго, у арт-прасторы будзе працаваць студыя гуказапісу, для якой плануецца закупіць абсталяванне. «Словам, робім усё для таго, каб нашы студэнты не толькі маглі ўдасканальваць як выкладчыкі пэўных дысцыплін, але і вучыліся працаваць з сучасным «лічбавым» пакаленнем. Сёння, на жаль, інтэрнэт не заўсёды дае магчымасць фарміраваць камунікатыўныя якасці ў дзяцей, таму настаўнік, які ўмее спяваць, танцаваць, іграць на гітары, арганізоўваць творчую працу з дзецьмі, будзе адпавядаць усім патрабаванням, якія прад'яўляюцца да сучаснага педагога», — дадаў Аляксандр Жук.

Адбылося таксама ўрачыстае адкрыццё кавярні «BSPU CAFE», разлічанай на 108 абедзенных месцаў з VIP-залай на 15 месцаў. Ва ўтульнай атмасферы студэнты змогуць не толькі паабедаць, але і весела правесці вольны час, арганізаваць святочныя мерапрыемствы. У новай кавярні адбылася размова міністра адукацыі і рэктара БДПУ ў фармаце адкрытага мікрафона са студэнтамі. Моладзь цікавілі пытанні, звязаныя з прафесіяй педагога, асобай настаўніка, а таксама абмяркоўваліся праблемы і дасягненні вышэйшай школы.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

Не вучобай адзінай

# ХТО СТАНЕ «СТУДЭНТАМ ГОДА — 2020»?

## Вызначыліся фіналісты рэспубліканскага конкурсу

**Да гэтага адбыліся абласныя і Мінскі гарадскі этапы. Для ўдзельнікаў былі падрыхтаваны разнастайныя конкурсныя выпрабаванні, дзе яны маглі праявіць свой артыстызм, аратарскае майстэрства, інтэлектуальныя і творчыя здольнасці. Выпрабаванні прайшлі як у вочным, так і завочным фармаце. У выніку вызначана 11 фіналістаў — чатыры юнакі і сем дзяўчат, якія прымуць удзел у рэспубліканскім фінале, паведамілі ў ЦК БРСМ.**



Фота з сайта БРСМ.

Так, Брэсцкую вобласць у ім будзе прадстаўляць студэнт трэцяга курса гістарычнага факультэта БрДУ імя А. С. Пушкіна Уладзіслаў Макарэвіч. Малады чалавек лічыць, што дзякуючы падтрымцы сяброў і блізкіх людзей яму ўдалося дастойна выступіць і заняць першае месца на абласным этапе. Акрамя звання «Студэнт года», ён таксама заваяваў тытул «Студэнт online».

Гонар Віцебскага рэгіёна будзе адстойваць студэнт трэцяга курса факультэта эканомікі і бізнес-кіравання Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Уладзіслаў Міроннчык. Малады чалавек актыўна прымае ўдзел у праектах Саюза моладзі і ўніверсітэта, розных творчых калектываў.

Ад Гомельскай вобласці ў фінальных спаборніцтвах пазмагаецца студэнтка чацвёртага курса факультэта кіравання працэсамі перавозак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту Дар'я Гелец. Дзяўчына — актыўная ўдзельніца і арганізатар канцэртаў і конкурсаў, з'яўляецца аўтарам трох навуковых работ.

Студэнтка пятага курса лячэбнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Анастасія Хлюпіна таксама пазмагаецца за званне «Студэнт года — 2020». Яна з'яўляецца валанцёрам атрада «Добрае сэрца ГрДМУ», а таксама інструктарам па першай дапамозе атрада хуткага рэагавання на надзвычайныя сітуацыі Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.

Магілёўскую вобласць у фінале будуць прадстаўляць дзве ўдзельніцы — гэта студэнтка трэцяга курса факультэта педагогікі і псіхалогіі дзяцінства Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова Лізавета Дуброўская і студэнтка трэцяга курса інжынерна-эканамічнага факультэта Беларуска-расійскага ўніверсітэта Арына Сафонава. Дзяўчаты дзякуючы конкурсу «Студэнт года» хочуць рэалізаваць свой патэнцыял і адкрыць новыя таленты і здольнасці.

Курсант трэцяга курса факультэта падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў Інстытута пагранічнай службы Уладзіслаў Федзюковіч таксама прайшоў у фінал. Хлопец абраў прафесію пагранічніка нездарма — Улад марыць гэтак жа, як і яго бацька, служыць на пагранічнай заставе. Абсалютна ўпэўненая ў сваіх сілах курсант другога курса факультэта тэхнасфернай бяспекі Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Кацярына Рудовіч. Дзяўчына — прызёр рэспубліканскіх спаборніцтваў па веславанні на байдарках і каноэ, пастаянны ўдзельнік вакальных конкурсаў і навукова-практычных канферэнцый.

Мінск на рэспубліканскім этапе прадставяць студэнтка другога курса факультэта маркетынгу, менеджменту, прадпрымальніцтва Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Алена Мятлушка і студэнтка другога курса Інстытута кіраўнічых кадраў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Ксенія Брыкун. Алена вельмі любіць музыку, а таксама міні-футбол. Галоўныя жыццёвыя прынцыпы Ксеніі — імкнуцца да дасканаласці, ісці толькі наперад і кіраваць сваёй будучыняй. Канкурэнцыю дзяўчатам у фінале таксама складзе курсант трэцяга курса ваеннага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Кірыл Гіро — чэмпіён Узброеных Сіл па вайсковым рукапашным баі 2019—2020 гадоў.

У конкурсе «Студэнт года» спаборнічаюць студэнты дзённай формы навучання ўстаноў вышэйшай адукацыі. Гэта маладыя людзі, якія вядуць актыўнае навуковае, творчае, спартыўнае, грамадскае жыццё і маюць сярэдні бал па выніках апошніх двух семестраў не менш як «8». Рэспубліканскі фінал плануецца правесці ў пачатку снежня, калі і стане вядома імя «Студэнта года — 2020».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Лакацыі актыўнасці

# У падтрымку маладых людзей дзвюх краін

**Другая частка VIII Беларуска-расійскага маладзёжнага форуму пройдзе 11—14 снежня. І адбудзецца яна, па словах першага сакратара Цэнтральнага камітэта БРСМ, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Дзмітрыя Варанюка, на тэрыторыі Беларусі.**

«Канчатковае рашэнне аб датах і праграме другой вочнай часткі маладзёжнага форуму было прынята ў Маскве пры правядзенні кансультацый з міністрам асветы Сяргеем Краўцовым і міністрам навукі і вышэйшай адукацыі Валерыем Фальковым падчас рабочага візіту беларускай дэлегацыі на чале з міністрам адукацыі Беларусі Ігарам Карпенкам, — распавёў Дзмітрый Варанюк.

У рабоце форуму прымуць удзел маладзёжныя дэлегацыі Беларусі і Расіі. У іх састаў увойдуць прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, органаў дзяржаўнай улады, міністэрстваў і ведамстваў, а таксама арганізацый-партнёраў — да 25 чалавек ад кожнага боку.

«Асноўная праграма разгорнецца ў Пінску. На палях форуму адбудзецца адкрыты дыялог з прадстаўнікамі профільных адукацыйных міністэрстваў. Запланавана работа секцый па тэме «Сацыяльныя праграмы падтрымкі моладзі Беларусі і Расіі». Размова пойдзе пра падтрымку маладзёжных лідараў, якія працуюць з моладдзю, супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў развіцці валанцёрства. Будуць разгледжаны праграмы па працаўладкаванні маладых беларусаў і расіян. Для ўдзельнікаў мерапрыемства падрыхтавана культурна-адукацыйная праграма па славутасцях сталіцы, Пінска і Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж», — адзначыў першы сакратар ЦК БРСМ.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

З прыцэлам на будучыню

# ПАДЧАС КАНІКУЛ — У АЎДЫТОРЫЮ ВНУ

**Навучальны год ужо даўно пачаўся, а гэта значыць, што праз некалькі месяцаў ВНУ краіны адкрыюць свае дзверы для абітурыентаў. Кожны выпускнік прыкладна арыентуецца, у якую канкрэтна ўстанову будзе падаваць дакументы, і актыўна рыхтуецца да ўступных экзаменаў.**
**Магчымасць на кароткі тэрмін акунуцца ў студэнцкае жыццё дае праект «Студэнт БДУ на тыдзень», дзявяты сезон якога прайшоў падчас асенніх школьных канікул. Прыняць удзел у ім могуць навучэнцы 10 і 11 класаў, адбор удзельнікаў праходзіць з дапамогай матывацыйных лістоў, у якіх школьнікі расказваюць, чаму яны хочуць стаць «студэнтамі на тыдзень» на адным з 18 факультэтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.**
**Вялікую колькасць анкет па традыцыі атрымаў журфак. Удзельнікі дзявятага сезона «Студэнт БДУ на тыдзень» на факультэце журналістыкі — вучаніца 11 класа Брэсцкага абласнога ліцэя Аліна БОБЕЛЬ і вучань 11 класа Івацэвіцкай сярэдняй школы № 3 Стас РАТАХІН — падзяліліся са мной уражаннямі ад праекта.**



### Што пісаць, каб трапіць у праект?

**Аліна:** — Не трэба быць залішне сур'ёзным і ставіцца да матывацыйнага ліста як да даклада на адзнаку. Назавіце рэальныя прычыны таго, чаму хочаце стаць студэнтам БДУ на тыдзень, што падштурхнула на гэта. Зацікаўлівайце, прыдумляйце цікавыя фарматы, каб ніхто не пазяхаў над чытаннем вашага эсэ.

**Стас:** — На маю думку, вы павінны напісаць пра тое, чаму менавіта ВАС трэба ўзяць на гэты праект. Не, не трэба пазначаць, што вы такі круты журналіст, а тым больш пералічваць усе свае дасягненні ў матывацыйным лісце. Можаце напісаць, як прыйшлі ў журналістыку, чаму хочаце паступіць у БДУ, чаго чакаеце ад удзелу ў праекце.

### Што запомнілася больш за ўсё?

**Аліна:** — Сама атмасфера студэнцкага жыцця. Студэнты вельмі актыўныя і камунікабельныя, заўсёды гатовыя адказаць на тваё пытанні і даць параду. Варта было б пахваліць яшчэ сталовую і смачную каву, без якіх, канешне, не абысціся. Я ўпэўнілася ў тым, што БДУ — сапраўды выдатны выбар і трэба імкнуцца і працаваць для паступлення.

**Стас:** — На жаль, эпідэміялагічная сітуацыя змяніла ўсе планы арганізатараў на гэты праект. Але самае галоўнае, што мерапрыемства ўсё ж такі адбылося. Магу адзначыць наведванне тэлекампаніі СТБ, лекцыі, якія мы наведвалі, свабоду студэнтаў — тут усім усё роўна, як ты выглядаеш і якой ты нацыянальнасці.

### Якія перавагі і недахопы заўважылі?

**Аліна:** — Да першых можна аднесці выдатную арганізацыю, якая цалкам дае зразумець усю сутнасць студэнцкага жыцця, бо мы не толькі забаўляліся, але таксама пабывалі на не вельмі цікавых парах, нам далі шмат патрэбнай і карыснай інфармацыі, нічога лішняга. Мінусаў было не так многа, але ўсё ж да іх я аднесла б тыя мерапрыемствы, якія мы не змаглі наведаць у сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй у краіне.

**Стас:** — Самае важнае ў праекце — намаганне паказаць нам студэнцкае жыццё такім, якое яно ёсць насамрэч. Вялікая перавага — студэнты, якія не толькі гэта арганізуюць, але і пазітыўна ўспрымаюць абітурыентаў. А недахопам з'яўляецца адсутнасць жылля для іншагародніх удзельнікаў.

### Вашы парады будучым «навабранцам»?

**Аліна:** — Ні ў якім разе не бойцеся. Калі хочаце — рабіце. Збіраецеся з думкамі, сядайце пісаць эсэ і наперад! Не варта хваляваецца, адкрывайце сэрца і намагайцеся. Гэта таго заслугоўвае.



**Стас:** — Не баяцца нічога. Я пра гэта і напісаў у сваім матывацыйным лісце. Так, вы павінны зрабіць усё ідэальна, але калі не атрымаецца, то жыццё на гэтым не заканчваецца. Крыўда перарадждаецца ў стымул, які дапамагае вам стаць лепшым за ўсіх.

### Не шкадуеш, што канікулы прайшлі такім чынам?

**Аліна:** — Не. Мае былі б сумныя, калі б не гэты праект, ды і дзеля такіх цудоўных аднагрупнікаў, з якімі я вучылася, варта было ахвяраваць канікуламі.

**Стас:** — На маю думку, я адпачываў больш, чым аднакласнікі. Пачынаецца сезон алімпіяд, і шмат сяброў кожны дзень хадзілі ў школу на падрыхтоўку, а я не толькі наведаў універсітэт сваёй мары, але і набыў цікавых аднадумцаў.

**Аліна, Стас:** — Вучышся ў 10 ці 11 класе? Ёсць жаданне прыняць удзел у праекце? Мы, маючы невялікі вопыт, кажам — спрабуй!

**Вера ФІЛОСАФ,**
**настаўніца рускай мовы і літаратуры Амелянецкай СШ Камянецкага раёна.**
**Фота з архіваў герояў.**

Свой выбар

# Як стаць аўтаінструктарам і вучыць іншых?

**Спецыяліст па ваджэнні — даволі стрэсавая і вельмі адказная прафесія, якая з кожным годам карыстаецца ўсё большым попытам з боку кліентаў. Як стаць майстрам у гэтай справе і з якімі цяжкасцямі даводзіцца сутыкнуцца, мы высветлілі ў дырэктара адной з мінскіх аўташкол 31-гадовага Аляксандра НОВІКАВА.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

## ПАЧАЛОСЯ ЎСЁ З... ДЗЯЎЧЫНЫ

— Я ўпершыню пабываў у аўташколе, калі мне было прыкладна гадоў дзесяць. У ёй працаваў сябра бацькі, таму даволі часта там пачаў «завісаць». Ужо ў той час мяне пачало цікавіць усё, звязанае з машынамі. А калі ў чатырнаццаць гадоў першы раз сеў за руль на закрытай пляцоўцы, канчаткова зразумеў, што гэта маё, — расказвае суразмоўнік. — Нягледзячы на гэта, у прафесію прыйшоў усё ж выпадкова. Калі вучыўся ў інстытуце па спецыяльнасці менеджар-эканаміст, мая дзяўчына захацела атрымаць пасведчанне кіроўцы, і я вырашыў уладкавацца ў аўташколу і стаць яе інструктарам, бо ўсе патрэбныя навыкі і дакументы на той момант у мяне ўжо былі. Вядома, не абышлося на ранніх этапах без цяжкасцяў. Самая галоўная — гэта максімальна хутка паглыбіцца ў навучальны працэс. Проста кіраваць аўтамабілем самому і навучыць вадзіць курсанта аўташколы, які ніколі не сядзеў за рулём, — абсалютна розныя рэчы. На шчасце, з гэтай задачай я справіўся даволі хутка, і практычна ўсе першыя навучэнцы здалі экзамен у Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі з першага разу, уключаючы маю дзяўчыну. Акрамя гэтага, асноўнай праблемай для мяне стала афармленне ўсёй неабходнай рабочай дакументацыі, бо яе было вельмі шмат і з вялікай колькасцю нюансаў і правілаў. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, я не толькі стаў прафесіяналам сваёй справы, але, дзякуючы ўпартасці і матывацыі, змог дасягнуць пасады дырэктара аўташколы.

## НІЯКАГА ЦІСКУ НА КУРСАНТАЎ

— Аўтаінструктары хоць і ўскосна, але адказваюць за жыцці людзей. Бо, калі мы дрэнна навучылі ці выдалі пасведчанне чалавеку, які не ўмее вадзіць, і па яго віне адбудзецца аварыя, то гэта будзе наша віна. Таму людзі маёй прафесіі павінны валодаць пералікам пэўных навыкаў і якасцяў. Думаю, тлумачыць, што сам інструктар павінен умець кіраваць машынай, нікому не трэба. *(Смяецца.)* Акрамя гэтага, добры спецыяліст павінен «ад» і «да» ведаць Правілы дарожнага руху і, акрамя тэорыі, умець прымяняць на практыцы. Таксама адзін з самых асноўных, але, напэўна, самых складаных навыкаў, — умець простай мовай растлумачыць вучню ўсе тонкасці кіравання.

Што датычыцца якасцяў, то ў першую чаргу любы аўтаінструктар павінен быць добрым псіхолагам для таго, каб знайсці падыход да кожнага курсанта. Бо людзі бываюць розныя, і да ўсіх патрэбна індывідуальнае стаўленне. Вядома ж, важная стрыманасць, ні ў якім разе нельга крычаць, а тым больш прымяняць фізічную сілу. Кажуць, і такое бывае. Таму што любы ціск з боку педагога прыводзіць да поўнай страты жадання вучыцца.

## І СТУДЭНТЫ, І ПЕНСІЯНЕРЫ

— Сярод маіх вучняў былі і ёсць людзі розных сфер дзейнасці і пасад: урачы, акцёры тэатра і кіно, дэканы навучальных устаноў... І гэта галоўны, на мой погляд, плюс прафесіі. З імі ўсімі вельмі цікава камунікаваць і пазнаваць нешта новае для сябе. З многімі з колішніх падапечных я камунікую нават пасля атрымання тымі правоў кіроўцы.

Гэтак жа ў аўташколах няма асаблівых абмежаванняў па ўзросце, але дакументы вам выдадуць не раней за васямнаццаць гадоў. У нашай навучальнай установе асноўную масу вучняў складаюць людзі ва ўзросце менавіта з васямнаццаці і да трыццаці гадоў. Найбольш актыўнымі ахвотнымі навучыцца вадзіць з'яўляюцца, вядома, студэнты. У іх такі ўзрост, калі працэс адбываецца «з лёту». Акрамя «стандартных» курсантаў былі і тыя, каму за семдзесят гадоў. Безумоўна, працэс асваення азоў даваўся ім складаней, але тым не менш і яны змаглі здаць паспяхова экзамен і атрымаць пасведчанне кіроўцы на роўных з усімі.

## ЯК ЗМАГАЦЦА СА СТРАХАМІ

— Прыкладна восемдзесят працэнтаў з тых, хто прыходзіць на навучанне, баяцца кіраваць аўтамабілем, таму што ні разу не сядзелі за рулём. І гэта зусім нармальнае пачуццё, бо боязь перад нязведаным — гэта натуральна. Пасля некалькіх заняткаў на аўтадроме пачуццё страху сыходзіць у большасці. Тым, у каго яно ўсё ж застаецца, я заўсёды тлумачу, што няма нічога немагчымага і ўсе праблемы, хваляванні мы зможам пераадолець.

Акрамя ўласнай няўпэўненасці, ёсць яшчэ адна праблема. Многія курсанты баяцца «не знайсці агульную мову з аўтамабілем». Да гэтага пытання асабіста я стаўлюся вельмі прынцыпова і маю шэраг патрабаванняў да навучальнага транспарту. У першую чаргу ён павінен быць сучасны, таму што час савецкіх машын ужо прайшоў. Па-другое, бяспечны і камфортны для засвойвання азоў кіравання. Курсант, сядаючы за руль, павінен адчуваць сябе зручна, тады і працэс ідзе нашмат лягчэй. У сукупнасці гэтыя фактары даюць выдатны вынік у працэсе. А далей ужо справа за ўпартасцю і жаданнем.

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка IV курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

# ПРОФІЛЬ ЖАРТАЎ І ЗАБАЎ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

У TikTok ствараюць кароткія відэа, накладваючы на іх розныя эфекты, фільтры, маскі, стыкеры і бясплатныя трэкі. Асноўныя карыстальнікі — моладзь, але нярэдка там можна ўбачыць бабуль і дзядуляў. Кожны паказвае тое, на што здатны, канкрэтна Максім абраў для сябе сферу гумару.

**«Рэквізіт, дарэчы, бяру з падручных сродкаў, падыходзіць амаль усё, што ёсць дома».**

— Каб «раскруціць» любы профіль, трэба не ленавацца, быць энергічным, завабіць карыстальніка так, каб з бясконцай стужкі кароткіх відэаролікаў ён абраў менавіта твой. Спачатку думаў здымаць, як і большасць тады, танцы або ліпсінкі (калі сінхронна адкрываеш рот пад музыку), аднак амаль адразу зразумеў, што «маё» — гэта гумарыстычны кантэнт. Ён падабаецца многім, усяго за 10—15 секундаў я паказваю жыццёвыя сітуацыі, у якіх можна пазнаць сябе, падумаць, «а са мной такое таксама здаралася!». У асноўным здымаю тое, ад чаго мне самому смешна. Я люблю жартаваць, у галаву прыходзіць шмат цікавых ідэй, іх запісваю з дапамогай смартфона. Напрыклад, многім вядомая сітуацыя, калі стомлены прыходзіш дадому ў надзеі на тое, што ўдасца выспацца, але ўсю ноч табе дакучае камар. Або калі ў цябе дрэнны зрок і ты па памылцы вітаешся з дрэвам, прымаючы яго за сябра. Падобныя відэа набіраюць дзясяткі і сотні тысяч праглядаў — усё таму, што «жыза».

Самае папулярнае відэа на канале Максіма — пародыя на песню групы «Грыбы» «Растае лёд». Яно сабрала тры мільёны праглядаў.

— Памятаю, калі ўпершыню ўбачыў такія лічбы, стала не па сабе, быў прыемна ўражаны, нават з сябрамі торт купілі, каб адзначыць падзею. Зразумеў, што магу больш, і стаў здымаць кантэнт яшчэ часцей. Зараз, калі гляджу свае старыя ролікі, разумею, што дастаткова добра «пракачаўся» ў якасці сваіх відэа. Але, як і ў той час, цяпер для рэалізацыі ўсіх сваіх ідэй шмат чаго не трэба: добры настрой, арыгінальная ідэя і штатыў, на які трэба замацаваць камеру ці тэлефон. TikTok добры тым, што ў ім неабавязкова валодаць сур'ёзнымі навыкамі мантажу, карыстацца спецэфектамі, гукам, усё максімальна проста і даступна праз любую мабільную праграму. Менавіта я пішу невялікі сцэнарый, каб у далейшым атрымалася мініяцюра. У асноўным мае ідэі — пра сяброў, бацькоў і адносіны паміж усімі намі. Рэквізіт, дарэчы, бяру з падручных сродкаў, падыходзіць амаль усё, што ёсць дома. Бо часта прыходзіцца адыгрываць у сваёй пастаноўцы ўсе ролі, таму трэба неяк здзіўляць гледачоў.

Максім падзяліўся, што на сёння ў яго скарбонцы калі 700 створаных відэаролікаў. У асноўным творчы працэс выглядае так: прыкладна да абеду прыдумляецца ідэя, пасля ідуць здымка, мантаж, і ўвечары гатовы прадукт выкладваецца ў профіль. Суразмоўнік кажа, што лепш не адыходзіць ад выпрацаванай сістэмы, бо ёсць пэўныя гадзіны, калі аўдыторыя найбольш актыўная. Напрыклад, вечарам, у той час, калі карыстальнікі прыходзяць з вучобы або работы і хочуць расслабіцца, паглядзець нешта лёгкае і цікавае.

**«У асноўным здымаю тое, ад чаго мне самому смешна. Я люблю жартаваць».**

— Часам здаецца, што ўсе жыццёвыя сітуацыі ўжо ў мінулым, але штораз у галаве з'яўляецца штосьці новае. Па сутнасці, я ствараю кантэнт амаль кожны дзень. Лічу, што стабільны выхад новых ролікаў — гэта важная ўмова для дасягнення поспеху ў гэтай сферы. Так хутчэй будзе прыходзіць не толькі новая аўдыторыя, але і рэкламадаўцы. Без рэкламы цяпер нікуды, хоць яе амаль ніхто і не любіць. Я ўжо супрацоўнічаў з буйнымі кампаніямі. Дарэчы, нават прыняў удзел у рэкламным роліку «Мангалайк», яго цяпер можна ўбачыць па тэлевізары.

На хейтараў хлопец увагі не звяртае. Лічыць, што ў кожнага свой густ, і гэта нармальна.

— Часам чытаю неабгрунтавана негатыўныя каментарыі пад ролікамі, яны могуць быць нават не па тэме. Думаю, што іх пішуць тыя, хто хацеў бы таксама ствараць нешта падобнае на маю творчасць, але саромеюцца. Такое прадузятае стаўленне можа быць і з-за таго, што не кожны разумее, як усё ўладкавана ў блогерскай сферы і што нам таксама бывае цяжка, як і тым, хто захоплены нечым іншым. Але, шчыра кажучы, дагэтуль не бачу сур'ёзных мінусаў у сваёй дзейнасці. Відэаблогінг дае ўпэўненасць у сабе. Тут можна паказаць свае таленты, тое, які ты ёсць на самай справе, і атрымаць падтрымку ад іншых. Таксама перыядычна нас запрашаюць на розныя цікавыя сустрэчы, фестывалі, мерапрыемствы. Яны даюць новыя знаёмствы, карыснае супрацоўніцтва. На вуліцах іншым часам мяне пазнаюць, але вельмі папулярным сябе не лічу. Бацькі ведаюць, чым я займаюся. Здзіўляюцца, калі падлеткі на вуліцы хочуць сфатаграфавацца са мной. Сябры і знаёмыя да майго захаплення цяпер ставяцца добра. Але калі ўсё толькі развівалася, шмат хто з іх казаў класічнае: «не займайся глупствам, лепш зрабі штосьці нармальнае».



Максім папярэджвае: перш чым пачаць займацца блогінгам, трэба загадзя падумаць над добрымі ідэямі, а потым не закідваць гэтую справу пасля першых няўдалых вынікаў ці негатыўных каментарыяў. «Гэта неад'емная частка такой сферы. Хутчэй за ўсё заваяваць увагу вялікай аўдыторыі ў адзін міг не атрымаецца. Падрыхтуйцеся да таго, што, як толькі вы знікнеце на тыдзень з поля зроку карыстальнікаў, гэта не вельмі добра адаб'ецца на статыстыцы вашага профілю. Таму лепш быць «на сувязі» са сваёй аўдыторыяй заўсёды, менавіта я знаходжуся анлайн не менш за пяць гадзін штодзень. Вядома, часам перазараджаю сябе, адключаючы смартфон, каб «абнавіць» сваю галаву і натхніцца на новыя ідэі».

**«Памятаю, калі ўпершыню ўбачыў такія лічбы, стала не па сабе, быў прыемна ўражаны».**

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

**Фота дадзена героем.**

Свая атмасфера

# МОДА БЫЦЬ СТЫЛЬНЫМ,

## ці Любіць тое, што робіш, і рабіць тое, што любіш

**Свет моды — рознабаковы і таямнічы. З вокладак часопісаў, подыумаў і рэкламныхролікаў на нас глядзяць прыгожыя дзяўчаты і юнакі з яркай або нестандартнай знешнасцю. Іх задача — прыцягнуць увагу мэтавай аўдыторыі або сфарміраваць прыемныя асацыяцыі з брэндам. А што ж на самай справе крыецца за гэтымі натхняльнымі кадрамі? Жаданне мадэлі працаваць над сабой, вучыцца і ўдасканальвацца. Арыгінальнае бачанне і ўменне фатографа карыстацца камерай. Майстэрскае валоданне сваёй справай візажыстаў, цырульнікаў і стылістаў. А на чале — мадэльнае агенцтва, якое каардынуе дзеянні паміж усімі неад'емнымі складнікамі гэтага займальнага, але такога працаёмкага працэсу.**
**Бліжэй пазнаёміцца з адной з крыніц прыгажосці і прафесіяналізму, акунуцца ў спецыфіку мадэльнай дзейнасці нам дапаможа Аляксандра СВЯТОХА — дзяўчына, якая ўжо больш за два гады адданая любімай справе.**


Аляксандра з Тамарай Ганчаровай.

— Вельмі ганаруся тым, што я — мадэль аднаго з найбуйнейшых і паспяховых у мадэльным бізнесе Беларусі агенцтваў. Захапляюся нашым дырэктарам — Тамарай Ганчаровай, якая з'яўляецца для мяне прыкладам для пераймання, узорам таленту і працавітасці. Нельга без захаплення назіраць за тым, як на рэпетыцыях перад паказамі яна заўсёды з бляскам у вачах асабіста дэманструе паходку, рухі і позы, якія мы павінны запомніць. Гэта матывуе і дапамагае настроіцца на пазітыўны лад, — не без усмешкі дзеліцца ўражаннямі Аляксандра.



Мадэлі агенцтва «Тамара» рэгулярна становяцца тварамі беларускіх марак, упрыгожваюць вокладкі часопісаў, удзельнічаюць у мерапрыемствах і паказах.

— Я заўсёды прымаю прапановы аб рабоце, якія паступаюць ад агенцтва. Гэта могуць быць фотасесіі, здымкі, паказы рознага ўзроўню, з дапамогай якіх многія айчынныя дызайнеры імкнуцца расказаць аб сваіх калекцыях, — тлумачыць Саша. — Самы важны паказ года — гэта BFW (Беларускі тыдзень моды). Я рада, што мне выдалася магчымасць стаць часткай мерапрыемства такога ўзроўню.

Каб трапіць на Тыдзень моды, мадэль павінна прайсці строгі кастынг: выклікаць прыемнае ўражанне ў дызайнера, які адбірае аблічча для сваёй калекцыі. І ў гэтым выпадку адной паходкі будзе недастаткова. На праглядзе трэба прадэманстраваць абаянне і харызму, раскрыць, у прамым сэнсе, свае найлепшыя бакі — пазіраваць. Без правільна падабраных поз нельга абысціся і на здымках. Усмешка вачыма, вобразы і ўспышкі камер — неад'емныя часткі працоўных будняў мадэлі.

— Нядаўна я прымала ўдзел у здымках праграмы «Дзень у вялікім горадзе» для тэлебачання, якая праходзіла ў дызайнерскай краме, — успамінае дзяўчына. — Над вобразамі працавала Таццяна Кейзерава — стыліст, заснавальніца і галоўны рэдактар анлайн-часопіса. Працаваць з ёй было адно задавальненне.

Дызайнерскія ўборы і брэндавы абутак — мара любога, хто імкнецца сачыць за модай і не ўпускаць навінак сезона. Але ці з'яўляецца модай толькі тое, што мы бачым на паказах або ў глянцавых часопісах? І што на сённяшні дзень больш выйгрышна: быць стыльным або модным? Гэтымі пытаннямі хоць бы раз у сваім жыцці задаваўся кожны з нас. Прытрымлівацца моды — гэта пераймаць тое, што мы бачым у фільмах, кліпах, часопісах. А апранацца стыльна — значыць, выкарыстоўваючы трэнд, выходзіць за яго рамкі, пазначаючы і робячы галоўнымі свае індывідуальнасць і імідж. Адным словам, сёння модна быць стыльным.

— Безумоўна, усё, што мы бачым у часопісах, па тэлевізары і на паказах, — актуальна і часткова стыльна. Але большасць маладых людзей глядзяць на мадэляў, якія прадстаўляюць моднае, дызайнерскае адзенне, і думаюць, што, падабраўшы падобны вобраз для сябе, будуць выглядаць таксама стыльна. Але, на жаль, так выходзіць не заўсёды. Не варта апранаць рэчы без разбору, у надзеі ўлавіць модныя веянні. Трэба ўмець адчуваць меру і мець густ. Бо кожны з нас індывідуальны, і што выдатна сядзіць на вас, можа выглядаць зусім недарэчна на іншым чалавеку. Хоць мне і самой часам хочацца надзець на сябе што-небудзь з серыі «прама з подыума» і прайсціся па горадзе. Але потым успамінаю, што я не на паказе! — са смехам кажа Саша.

Некаторым здаецца, што работа мадэлі заключаецца толькі ў пазіраванні перад камерай і шпацырах у прыгожых строях на подыумах. Насамрэч не ўсё так проста. Самае цяжкае ў такім занятку — гэта змена вобразаў паміж мерапрыемствамі. Перад дэфіле або здымкамі мадэлям даводзіцца па некалькі гадзін сядзець на адным месцы, пакуль над імі працуюць стылісты і візажысты. Кастынгі могуць праводзіцца ў адзін дзень у розных пунктах горада, размешчаных на вялікай адлегласці адзін ад аднаго, і ўсюды трэба паспець. А часам даводзіцца здымацца ў экстрэмальных умовах, напрыклад у футры ў 30-градусную спёку або ў купальніку на снезе. Так што праца мадэлі — не заўсёды адна суцэльная весялосць.

Мадэлям, у тым ліку і plus-size, трэба заўсёды трымаць сябе ў добрай форме. Калі агенцтва наймае іх, у кантракце, як правіла, прапісваецца, што дзяўчаты і юнакі павінны прытрымлівацца сваіх цяперашніх параметраў. А для гэтага прыходзіцца трэніравацца і правільна харчавацца на рэгулярнай аснове, падтрымліваць здароўе скуры і прыгажосць валасоў. Таму маладыя людзі імкнуцца есці здаровую ежу і не забываць аб фізічных нагрузках. Гэта важна не толькі таму, што правільнае харчаванне дапамагае захаваць добрую фігуру, але і таму, што збалансаваны рацыён — залог добрага самаадчування. Без гэтага пры такім актыўным рытме жыцця проста ніяк. Хоць, вядома, часам парадаваць сябе прысмакамі можна.

— На мой погляд, самае складанае для многіх маладых людзей у гэтай рабоце — трымаць сябе ў тонусе і не даваць слабіны. Цела — наш другі твар. Часам даводзіцца дэманстраваць рэчы, якія падкрэсліваюць постаць. І калі мадэль любіць сваё цела і клапоціцца аб ім, то вобраз будзе выглядаць элегантна і вытанчана, — расказвае Аляксандра. — Я вось, напрыклад, да сваёй скуры стаўлюся вельмі адказна і педантычна. Старанна сачыць за ёй і падбіраць спецыяльны догляд — для мяне гэта як асобны від мастацтва. У ім няма крэмаў, а толькі гігіена. Усе мае сябры і знаёмыя ведаюць, што я не дазваляю дакранацца да твару рукамі. Мне вельмі не падабаецца, што некаторыя ўспрымаюць гэта як жарт і імкнуцца хоць бы пальцам правесці па ім. Я адразу ж бягу яго мыць! Мяне работа мадэлі не прыгнечвае, нягледзячы на дыеты, догляд за скурай і валасамі. Бо гэта адно задавальненне!

Яшчэ адным важным аспектам з'яўляецца псіхалагічная ўстойлівасць. Гэты бізнес — досыць спецыфічнае асяроддзе з канкурэнцыяй, стрэсамі і перажываннямі.

— Але міф пра варожасць і нядобразычлівасць у мадэльнай сферы даўно перастаў быць актуальны. Насамрэч мадэлі часта сябруюць, дзеляцца вопытам, інфармацыяй аб агенцтвах, дапамагаюць пачаткоўцам хутчэй асвоіцца ў прафесійным плане. На жаль, шалёны рытм жыцця звязаны з пастаянным стрэсам, і ён таксама з'яўляецца часткай паўсядзённай рэчаіснасці мадэлі. Але не варта забываць, што добры настрой, свежы выгляд дакладна перашкодзяць стрэсу захапіць вас у свой палон. Касметыка, СПА-салоны, фітнес — гэта добра, але здаровы сон, прагулкі на свежым паветры ніхто не адмяняў! Залог псіхалагічнага дабрабыту і спадарожнага яму поспеху, як банальна бы гэта ні гучала, — любіць тое, што робіце, і рабіць тое, што любіце. Я заўсёды іду на паказы з добрым настроем. Мне часам здаецца, што няма нічога і нікога, хто змог бы сапсаваць мне яго напярэдадні мерапрыемства! Тыя моманты перад выхадам на подыум хочацца перажываць зноў і зноў, — расказвае мадэль.

Высокага росту і адпаведных параметраў у гэтай сферы бывае недастаткова. Для работы мадэлям часта патрабуюцца выдатныя камунікатыўныя навыкі, абаянне, уменне пераконваць і здольнасць выразна адказваць на пастаўленыя пытанні. Плюсам таксама становіцца веданне замежных моў.

**Апранацца стыльна — значыць, выкарыстоўваючы трэнд, выходзіць за яго рамкі, пазначаючы і робячы галоўнымі свае індывідуальнасць і імідж.**

— Дзяўчаты, якія хочуць паспрабаваць сябе ў мадэльным бізнесе, калі ласка, вучыце іх. І нічога не бойцеся! Калі хочаце стаць мадэллю, дык імкніцеся да пастаўленай мэты і не адступайцеся ад сваёй мары пасля першай жа адмовы. А калі вы ўжо працуеце ў мадэльным бізнесе, то не хвалюйцеся і тым больш не ўспрымайце блізка да сэрца, калі работадавец адхіліў вашу кандыдатуру. Бо, каб падабраць падыходзячую мадэль, звяртаецца ўвага на спецыфічныя асаблівасці прадукцыі і густавыя перавагі мэтавай аўдыторыі — спажыўцоў гэтага тавару. Напрыклад, адбіраючы людзей для прэзентацыі актыватара для росту валасоў, не запросяць мадэль з кароткай стрыжкай, а для рэкламы аўтазагару — дзяўчат ці юнакоў са светлай скурай. Заставайцеся цярплівымі і ўпэўненымі ў сабе. У вас усё абавязкова атрымаецца!



**Надзея БОБРЫК, студэнтка III курса факультэта міжкультурных камунікацый МДЛУ.**

**Фота з архіва гераіні.**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

## ОАО «БЕЛАРУСЬРЕЗИНОТЕХНИКА»

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Беларусьрезинотехника»** (УНП 700069297) 213829, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, в лице управляющего в деле о банкротстве Мясоедова Руслана Федоровича.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области будут проведены: **11 декабря 2020 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Полуприцеп МАЗ 93801, бортовой 1991 года выпуска, кузов (рама) шасси – 064 | 2070,00 | 1656,00 |
| 2 | Экскаватор ЭО-3322И, г.в н.у., инв. № 8362 | 7380,00 | 5904,00 |
| 3 | Экскаватор одноковшовый ЭО -2621, г.в. н.у, заводской номер н.у., инв. № 8361 на базе трактора ЮМЗ-6КЛ, 1991 г.в. | 4050,00 | 3240,00 |
| 4 | Полуприцеп МАЗ 9758, бортовой тентовый, 1999 года выпуска, кузов (рама) № Y3M975800X0001278 | 4590,00 | 3672,00 |
| 5 | Станок радиально-сверлильный 2 Е52, инв. № 2031 | 2070,00 | 1656,00 |
| 6 | Круглошлифовальный станок, инв. № 6025 | 5220,00 | 4176,00 |
| 7 | Станок плоскошлифовальный, инв. № 6031 | 6750,00 | 5400,00 |
| 8 | Станок плоскошлифовальный, инв. № 6032 | 3150,00 | 2520,00 |
| 9 | Станок трубогибочный, инв. № 6038 | 990,00 | 792,00 |
| 10 | Станок торцовочный (ленточная пила), инв. № 9514 | 1440,00 | 1152,00 |
| 11 | Станок строгальный четырехсторонний, инв. № 9536 | 3150,00 | 2520,00 |
| 12 | Координатно-расточной станок КР-450, инв. № 9537 | 2250,00 | 1800,00 |
| 13 | Поперечно-строгальный станок, инв. № 28807 | 3420,00 | 2736,00 |
| 14 | Станок фрезерный ОФ-55, инв. № 28813 | 5850,00 | 4680,00 |
| Местонахождение – **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102**, тел. +375 29 698-53-53 подробная информация на BELTORGI.BY | | | |

Для участия в торгах необходимо в срок <u>с 27.11.2020 г. 09.00 по 10.12.2020 г. 17.00:</u> 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация». Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее десяти рабочих дней со дня завершения электронных торгов.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению КУП «СЛУЦКОЕ ЖКХ» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ПОМЕЩЕНИЯ (НАЗНАЧЕНИЕ – СКЛАДСКОЕ ПОМЕЩЕНИЕ)

**общей площадью 156,5 кв. м, инв. № 640/D-63522, расположенного по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Гагарина, 36А-4.**

**Начальная цена** без НДС – **26 800,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **2 680,00** бел. руб.).

**Условия:**

- в случае отсутствия необходимости изготовления проектной документации в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество проинформировать Слуцкий районный исполнительный комитет (далее – райисполком) об отсутствии необходимости получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательских работ;

- в случае необходимости проведения работы, требующей изготовления проектной документации:

обратиться в райисполком для получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательских работ не позднее одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество;

начать разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательских работ в течение 6 месяцев с даты получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательских работ;

согласовать с комитетом по архитектуре и строительству Минского областного исполнительного комитета предварительный проект на реконструкцию недвижимого имущества либо строительство нового с обязанностью его реализации;

заключить договор купли-продажи недвижимого имущества на условиях, определенных Слуцким райисполкомом.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Аукцион состоится **28.12.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.12.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**

УНН 600154264

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Солигорскводстрой» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ МАСТЕРСКОЙ КИРПИЧНОЙ ДЛЯ РЕМОНТА ТЕХНИКИ

***(составные части и принадлежности: 2 пристройки)*, площадью 861,6 кв. м, инв. № 643/С-14488, расположенной на земельном участке с кадастровым номером 623450100001003222 *(право аренды по 04.08.2119)* площадью 0,3071 га, по адресу: Минская область, Любанский район, г. Любань, ул. Боровика, 46/8.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей до 1000 вольт, пл. 0,0050 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **32 716,76** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **3 271,68** бел. руб.). <u>***Начальная цена снижена на 50 %***</u>.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. <u>Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.</u> Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 17.09.2020.

Аукцион состоится **08.12.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.12.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**

УНН 600028496

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: изолированное помещение, инв. № 410/D-17243 (назначение – складское помещение 4 02 05, наименование – помещение склада с рампой), общей площадью 2884,9 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1А-2.
Лот № 1 находится на земельном участке, кадастровый № 420850100001008310, площадью 0,3789 га (назначение – земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения (для обслуживания и эксплуатации здания склада с рампой)), расположенном по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1А (доля в праве 49/100).
Начальная цена продажи лота – 88 754,48 руб. (восемьдесят восемь тысяч семьсот пятьдесят четыре рубля сорок восемь копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 8 875 руб. (восемь тысяч восемьсот семьдесят пять рублей)

ЛОТ 2:
- капитальное строение, инв. № 410/С-28262 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – забор), общей площадью 702,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е, забор;
- капитальное строение, инв. № 410/С-28181 (назначение – 2 29 08 здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад кирпичный), общей площадью 814,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е/2;
| 3 | Изолированное помещение (назначение: помещение финансового назначения; наименование: изолированное помещение) с инвентарным номером 240/D-53722, общей площадью 28,5 кв. м | Витебская обл., г. Орша, ул. Владимира Ленина, 77-181в | 52 800,00 руб., в т. ч. НДС по ставке 20 % – 8 800,00 руб. |
| 4 | Капитальное строение (назначение: здание специализированное автомобильного транспорта; наименование: гараж) с инвентарным номером 200/С-98629, общей площадью 49,0 кв. м | г. Витебск, пр-т Строителей, 12В | 16 920,00 руб., в т. ч. НДС по ставке 20 % – 2 820,00 руб. |

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1 в срок до 16.00 23.12.2020.

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота в срок до 12.00 23.12.2020 на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

**Аукцион состоится 28.12.2020 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.**

Особые условия: победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ. Покупатели на **Лоты 1–3** дополнительно возмещают расходы по оценке имущества (149,40 руб. с НДС).

Дополнительно победитель аукциона приобретает объекты основных средств, расположенные в:

**Лот 1:** изолированном помещении с инв. номером 240/D-53720 по стоимости 393,63 руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %): противомоскитная сетка (2 шт.), сетка противомоскитная разм. 86х157, сетка противомоскитная разм. 106х130, кондиционер TADIRAN GTM 18H, кондиционер MITSUBISHI SRK40HG-S, тепловая завеса NEOKLIMA ТЗС 610.

**Лот 2:** изолированное помещение с инв. номером 240/D-53721 по стоимости 555,17 руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %): сетка противомоскитная разм. 94х180, сплит-система кондиционирования.

**Лот 3:** изолированное помещение с инв. номером 240/D-53722 по стоимости 8,00 руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %): сетка противомоскитная разм. 90х180.

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее, чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

**Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8 (029) 309-42-19.**

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Могилевское областное управление № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | **Изолированное помещение с инвентарным номером 736/D-1954, расположенное по адресу: Могилевская область, Чериковский район, пос. Майский, общей площадью 19,2 кв. м, в 2-этажном административном здании** |
| **Начальная цена продажи** | 4000,00 (Четыре тысячи белорусских рублей, 00 копеек), в т. ч. НДС 20 % – 666,67 (Шестьсот шестьдесят шесть белорусских рублей 67 копеек) |
| **Сумма задатка** | 200,00 (Двести белорусских рублей 00 копеек) – 5 % |
| **Открытый аукцион состоится** | **22.12.2020 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | В рабочие дни с 9.00 до 16.00 по 21.12.2020 включительно по адресу: г. Могилев, ул. 30 лет Победы, д. 3, второй этаж, кабинет 209 |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по тел. (8-0222)-632792. моб. 8029-169-39-68 |

*Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 200,00 белорусских рублей на счет № BY 69 AKBB 66708597000020000000, БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.*

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Заключительная регистрация участников аукциона – 22 декабря 2020 г. с 10.30 до 10.55. Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены. Шаг аукциона – 5 % от первоначальной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 40 банковских дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона.

## ООО «СпецРеализация»
## объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «ПАПРИКА»

(УНП 690372343, Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ратомка, ул. Минская, д. 8, ком. 3),

**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).**

***Дата и время проведения торгов:* 29 декабря 2020 года.**

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 26 ноября 2020 года по 28 декабря 2020 года.

***Место проведения торгов:*** Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.

***Организатор торгов:* ООО «СпецРеализация»** (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «ПАПРИКА» (УНП 690372343)** в лице антикризисного управляющего – индивидуального предпринимателя Радченко Кирилла Игоревича.

| № лота | Наименование | Начальная цена, руб. | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Грузовой автомобиль MERCEDES-BENZ SPRINTER 313 CDI, 2010 г/в, кузов WDB9051331N444032, рег. номер АН 7070-5. | 31 100,00 | 5 % | 5 % |

***Для участия в торгах необходимо:***

1. В срок до 17.00 **28 декабря 2020 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 28.12.2020 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества**
**ОАО «Белэнергоснабкомплект» (Продавец)**

**Лот № 1:** GAZ-32213, кузов (рама) X96322130B0690287 / 322100B0466683. Цена – 8160,00 руб. Задаток – 816,00 руб. **Лот № 2:** MAZ 5440A8-360-031, кузов (рама) Y3M5440A880001645. Цена – 11 040,00 руб. Задаток – 1104,00 руб. **Лот № 3:** MAZ 975830-3012, кузов (рама) Y3M97583080003767. Цена – 4560,00 руб. Задаток – 456,00 руб. Цена по Лотам №№ 1–3 является начальной ценой с учетом НДС. **Местонахождение** Лотов: г. Минск, 1-й пер. Монтажников, 8. Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 12.01.2021 в 11.00**
**по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **06.01.2021 в 11.00.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
**(Организатор аукциона)**
информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
**Государственному предприятию «Гостиничный комплекс «Юбилейный» (Продавец)**.

**Лот № 1:** Оборудование для боулинга в к-те Китай, инв. № 0000003242 (полный перечень комплекта на сайте ino.by).
Местонахождение: г. Минск, пр-т Победителей, д. 19.
Начальная цена с НДС – 12 000,00 руб.

**Аукцион состоится 07.12.2020 в 11.00**
**по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, принадлежащего РУП «Белпочта»

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, BYN | Сумма задатка, BYN | Общая площадь, кв. м | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Срок договора аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ:** Помещения площадью 33,8 кв. м, расположенные в капитальном строении с инвентарным номером 100/С-57288 (наименование: отделение почтовой связи; назначение: здание специализированное связи), расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Адамковская, 58А | 150,83 | 15,08 | 33,8 | 3,0 | не менее 3 лет |

**Организатор аукциона: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

*Реквизиты для перечисления задатка: р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245*

**Аукцион состоится 29 декабря 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Последний день приема заявлений – 28 декабря 2020 г. до 17.00**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/3984)

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)**
**по поручению ОАО «Молодечненский райагросервис» (продавец)**
**проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

**- здание ПТО с инв. № 630/С-75080, общ. пл. 134 кв. м,**
**- здание мастерской** *(составные части и принадлежности: асфальтобетонное благоустройство территории, забор, внутренние электрические сети)* **с инв. № 630/С-75050, общ. пл. 2211,7 кв. м,**
**- арочник** *(составные части и принадлежности: площадка для хранения техники)* **с инв. № 630/С-75049, общ. пл. 610,3 кв. м,**
**- столярный цех с инв. № 630/С-76369, общ. пл. 167,8 кв. м,**
**- проходная с инв. № 630/С-76387, общ. пл. 25,2 кв. м,**
**- здание АЗС с инв. № 630/С-75048, общ. пл. 17,3 кв. м,**
**- здание автомойки** *(составные части и принадлежности: эстакада)* **с инв. № 630/С-78789, общ. пл. 38 кв. м,**
**- здание цеха по ремонту автомобилей с инв. № 630/С-78788, общ. пл. 906,2 кв. м,**
**- артскважина** *(составные части и принадлежности: подземная камера, фильтр проволочный, электропогружной насос)* **с инв. № 630/С-78787, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 623884308601000686 площадью 2,7200 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Молодечненский район, Тюрлевский с/с, д. Носилово, ул. Новая, 2Б;**
**- гараж** *(составные части и принадлежности: две смотровые ямы)* **с инв. № 630/С-76129, общ. пл. 198,3 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 623884308601000687 площадью 0,1600 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Молодечненский район, Тюрлевский с/с, д. Носилово, ул. Новая, 2Б/7.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 1 079 520,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 107 952,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи, на депозитный счет Министерства юстиции Республики Беларусь. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **12.01.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.01.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**

УНН 600077381

# ВОСТРАЯ ДЭМАГРАФІЧНАЯ НЕДАСТАТКОВАСЦЬ

## Чаму Латвія страчвае жыхароў?



**За дзесяць месяцаў гэтага года ў Латвіі зарэгістравана 14 878 нованароджаных, што на 5,8 працэнта — на 916 немаўлят, менш, чым за адпаведны перыяд летась. Аб гэтым сведчаць даныя Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення. У мінулым месяцы зарэгістравана ўсяго 1375 нованароджаных, што амаль на 12 працэнтаў менш, чым у кастрычніку 2019-га, паведаміў mixnews.lv. Як заявіў у эфіры Latvijas Radio дэмограф Ілмар Межс, сёлета Латвію чакае антырэкорд нараджальнасці. Пры высокай смяротнасці гэта азначае адно — колькасць насельніцтва прыбалтыйскай дзяржавы працягвае імкліва змяншацца. Чаму Латвія губляе жыхароў?**

### ТРЫВОЖНЫЯ ТРЭНДЫ

Усяго за гады незалежнасці Латвія страціла траціну жыхароў — з 2,7 мільёна чалавек у рэспубліцы засталося 1,9 мільёна. Краіна ўваходзіць у дзясятку дзяржаў свету па тэмпах змяншэння насельніцтва, займае па гэтым паказчыку другое месца ў Еўрасаюзе, адзначае iz.ru.

Адметна, што да атрымання незалежнасці колькасць жыхароў няўхільна павялічвалася. Натуральны прырост назіраўся нават у першыя гады пасля Другой сусветнай вайны. Рэкордным ён стаў у 1961-м, антырэкордным — у 1994-м. На савецкі перыяд прыпадае і шлюбны пік. Больш за ўсё вяселляў згулялі ў 1978 годзе, менш за ўсё — у 1992-м.

Заканамернае наступства дэпапуляцыі — дэўрбанізацыя. У трэціне латвійскіх населеных пунктаў колькасць жыхароў не перавышае 50 чалавек. У снежні 2019 года з-за скарачэння пасажырапатоку Латвійская чыгунка закрыла восем чыгуначных станцый. «Прыпынкі больш не патрэбныя. Людзей няма, краіна вымірае. «Балтыйскі леў»... Поспех», — сумна іранізаваў дэпутат рыжскага самакіравання Ігар Кузьмук.

Хутчэй за ўсё колькасць насельніцтва скарачаецца на ўсходзе Латвіі — у рэгіёне Латгалія. Расце толькі ў Прырыжскім рэгіёне. Дэмографы тлумачаць гэта тым, што менавіта сюды пераязджаюць маладыя жыхары Рыгі, якія не могуць дазволіць сабе куплю кватэры ў латвійскай сталіцы.

Адна з прычын крызісу — старэнне насельніцтва. «Патэнцыйныя бацькі не з'явіліся на свет у 1990-я. Але нават калі б з'явіліся, то цуду ўсё роўна б не здарылася. Латвійцы не гатовыя да афрыканскага ўзроўню нараджальнасці, не гатовыя нараджаць па 4—5 дзяцей», — кажа дэмограф Ілмар Межс.

Паводле даных Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення Латвіі, сярэдні ўзрост жыхароў рэспублікі няўхільна расце. «Хочам мы гэтага ці не хочам, але жыццё такое, што мы старэем. Сярэдні ўзрост у Латвіі павялічыўся, мы паступова становімся больш сталымі. Напрыклад, у 2000-м сярэдні ўзрост складаў 38,3 года, цяпер — 42,7 года. У 2030-м амаль палова жыхароў будзе старэйшая за 50 гадоў, а колькасць працуючых скароціцца на 20 працэнтаў», — заўважыла прафесар Латвійскага ўніверсітэта Зайга Крыш'янэ.

Характэрная прыкмета сучаснай Латвіі — пераафсталяванне навучальных устаноў у дамы састарэлых. Напрыклад, у 2016 годзе адпаведным чынам змянілася прызначэнне школы ў пасёлку Дзервэ — да таго моманту ў малодшых класах тут заставалася пяць дзяцей. У Яўнгулбенскай валасці перапрафілявалі не толькі школу, але і прафесійнае вучылішча. Калі дзяцей у навучальных установах не хапае, то пажылыя людзі для таго, каб патрапіць у пансіянат, доўга стаяць у чарзе, некаторых адпраўляюць у суседнія самакіраванні.

Яшчэ адна прычына крызісу — масавая міграцыя. Пасля ўступлення Латвіі ў Еўрасаюз у 2004 годзе з краіны выехалі 360 тысяч чалавек, гэта значыць кожны пяты жыхар, паведаміла iz.ru. Часцей за ўсё грамадзяне пераязджаюць у багатыя еўрапейскія дзяржавы, дзе вышэйшыя заробкі і лепшая сацыяльная абарона. Пры гэтым мігруюць у асноўным маладыя людзі рэпрадуктыўнага ўзросту.

«Моладзь змяншаецца хутчэй, чым насельніцтва ў цэлым. Калі ў 2009 годзе доля моладзі складала 11 працэнтаў, то цяпер — 6,4 працэнта насельніцтва Латвіі. Гэта другі самы нізкі паказчык у ЕС», — адзначыла намеснік дырэктара дэпартамента сацыяльнай статыстыкі ЦСУ Байба Зукула.

Поўныя сем'і становяцца рэдкасцю. Паводле даных Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення Латвіі, цяпер самы распаўсюджаны тып сям'і ў краіне — з адным з бацькоў, другі — пары без дзяцей. На пачатак 2020 года ў краіне налічвалася 508,7 тысячы сем'яў. Гэта на 13 працэнтаў, або на 79 тысяч менш, чым у 2011-м. Вяселляў становіцца ўсё менш — за дзесяць месяцаў гэтага года ў Латвіі зарэгістравана 9578 шлюбаў, што на 16,4 працэнта — на 1875 шлюбаў — менш, чым за адпаведны перыяд летась.

### МЕНШ, ЧЫМ НАСЕЛЬНІЦТВА РЫГІ

Брытанскі навуковы часопіс The Lancet піша, што ў Латвіі да 2100 года застанецца 430 тысяч жыхароў. У сталіцы гэтай балтыйскай краіны цяпер налічваецца каля 693 тысяч жыхароў. Такім чынам, уся Латвія стане меншая, чым Рыга, дае песімістычны прагноз штотыднёвік Dienas Bizness, змясціўшы адпаведную назву артыкула на вокладку друкаванага выдання. І гэта не проста гучная назва, а новая рэальнасць. Бо за апошнія 27 гадоў, гэта значыць фактычна з моманту здабыцця рэспублікай незалежнасці, насельніцтва краіны скарацілася амаль на 800 тысяч. Для параўнання: амаль столькі ж Латвія страціла за гады Першай сусветнай вайны.

Былы старшыня Савета па супрацоўніцтве малых і сярэдніх прадпрыемстваў Андрыс Ласманіс справядліва задаецца пытаннем: «Калі страты чалавечага рэсурсу дзяржавы такія ж, як і ў гады вайны, але вайны не было, то паўстае пытанне: чаму гэта адбываецца?» Ласманіс заўважае, што на змяншэнне колькасці насельніцтва ўплывае чалавечы фактар: старасць і смяротнасць, пры гэтым узровень нараджальнасці таксама катастрафічна нізкі. Ён робіць такую выснову: усё, што адбываецца — вынік палітыкі, якая праводзіцца дзяржавай. З-за гэтага Латвія аказваецца адным з лідараў па адтоку насельніцтва з паказчыкам у 18,2 працэнта.

Як заўважыла галоўны рэдактар Dienas Bizness Аніта Кантанэ, дэмаграфічная сітуацыя ў Латвіі — гэта не «сённяшняя праблема». «Аднак яна можа стаць заўтрашняй, бо негатыўная крывая колькасці жыхароў бачная ўжо сёння, і гэта на эканоміцы адбіваецца ўжо сёння, калі адную працоўную тэба зарабіць сродкі для ўсё большай колькасці тых, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні. Рэспектабельны The Lancet нам «на падносе» падаў сітуацыю будучага, якую магчыма прадухіліць», — лічыць Аніта Кантанэ.

Аўтар Dienas Bizness Яніс Шкупеліс перакананы: адзіны шанц — гэта павышэнне нараджальнасці, інакш у Латвіі неўзабаве застануцца адны старыя. Насельніцтва скароціцца з натуральных прычын. «Дзеці — адзіная крыніца багацця будучага грамадства», — заўважыў Яніс Шкупеліс.

### СЯМ'Я ПАД УДАРАМ

Латвіі патрэбен свой асобны міністр па справах дзяцей і сям'і, паколькі цяпер адпаведныя пытанні не з'яўляюцца прыярытэтнымі ні для аднаго ведамства. Як вынік, дзяржпадтрымка бацькоў з дзецьмі недастатковая, неабходныя паслугі (напрыклад, дзіцячыя садкі) далёка не заўсёды даступныя, а Міністэрства фінансаў прапануе рэформы, якія выгадныя бяздзетным, але невыгадныя сем'ям з дзецьмі, лічыць дэмограф Ілмар Межс.

«У ЕС ёсць краіны, якія падтрымліваюць сем'і на дастатковым узроўні: Скандынавія, Ірландыя, Францыя, Данія, Нідэрланды, Люксембург, Бельгія і Эстонія. І ёсць рэгіёны, якія вельмі скупыя ў дачыненні да сваіх сем'яў з дзецьмі. Гэта Міжземнамор'е, Усходняя Еўропа і Латвія. Латвія — адна з апошніх па бюджэтнай падтрымцы сем'яў з дзецьмі ва ўсім Еўрасаюзе. І гэта адбіваецца на нашым вартым жалю дэмаграфічным балансе. Колькасць нованароджаных на вельмі нізкім узроўні. Сёлета ў нас, напэўна, будзе антырэкорд па колькасці нованароджаных за апошнія гадоў сто — фактычна за ўвесь час, што вядзецца іх падлік», — паведаміў Ілмар Межс.

Адказваючы на пытанне, як ён ацэньвае рэформу сямейных дапамог, пра якую абвясціў прэм'ер-міністр Крыш'яніс Карыньш (з 2022-га на адно дзіця яна павінна вырасці да 25 еўра ў месяц, за двух — да 100, на трох — да 225, за чатырох — да 100 за кожнае дзіця), эксперт заўважыў, што гэта насамрэч ніякая не рэформа, а проста невялікае, але сапраўды неабходнае паляпшэнне даволі запушчанай дзяржавай сферы.

«Але трэба разумець, што ёсць абставіны, з якімі мы ўжо нічога не можам зрабіць. У прыватнасці, у нас моцна памяншаецца колькасць патэнцыйных бацькоў, будучых маці. Таму што агульная колькасць тых, хто нарадзіўся ў 1990-я ўдвая меншая, чым тых, хто нарадзіўся ў 1980-х. Таму нават пры нейкіх паляпшэннях (у сферы сямейнай палітыкі) мы не можам разлічваць на ўсплёск нараджальнасці. Мы можам толькі спадзявацца, што спад на нейкі час спыніцца», — адзначыў дэмограф.

Ды і не факт, што агучаныя Карыньшам памеры дапамог стануць рэальнасцю. «Аб дэмаграфіі шмат сказана, шмат дакументаў напісана, але ў краіне ёсць адзін самы галоўны дакумент палітыкі — гэта бюджэт. І калі сямейная палітыка не пацвярджаецца ўкладаннямі ў бюджэце-2021, усё сказанае на гэтую тэму застаецца балбатнёй», — канстатаваў Ілмар Межс.

Абвешчаныя (але пакуль не рэалізаваныя) змены патрэбныя ў абавязковым парадку, але іх зусім недастаткова для таго, каб латвійскія сем'і з дзецьмі атрымалі прымальны ўзровень камфорту, падкрэсліў эксперт. Паводле яго слоў, сямейная палітыка не павінна абмяжоўвацца толькі дапамогамі, паколькі вельмі вялікую ролю адыграюць іншыя паслугі — у прыватнасці, даступнасць дзіцячых садкоў.

«Я ніяк не магу зразумець, чаму папярэдняя Рыжская дума за 10 гадоў не змагла вырашыць гэтую праблему ці хоць бы паменшыць чэргі ў дзіцячыя садкі. Цяпер, калі дзіця нарадзілася ўчора, ужо сёння трэба бегчы запісваць яго ў чаргу, і тады, можа быць, гады праз тры яму знойдзецца месца. А часцей за ўсё — асабліва ў латышскіх дзіцячых садках — яно вызваліцца, калі дзіцяці ўжо чатыры гады. І што рабіць маці або бацьку, калі яны ўжо, здаецца, павінны вярнуцца на работу, каб пракарміць сям'ю, а дзіця пакінуць няма дзе? Гэта бязвыхадная сітуацыя», — лічыць Ілмар Межс. Так, кажа ён, ёсць магчымасць адправіць дзіця ў прыватны садок і атрымаць сафінансаванне ад муніцыпалітэта, але нават з гэтай падтрымкай хутчэй за ўсё давядзецца даплачваць 100—150, а то і ўсе 200 еўра з уласнай кішэні, і далёка не кожная сям'я можа пацягнуць такія выдаткі.

«Самакіраванні — не нейкія княствы на астравах, непадуладныя дзяржаве. Тую ж самую Рыжскую думу ўрад павінен быў прымусіць выконваць закон. Напрыклад, у Швецыі, калі самакіраванне не спраўляецца і не можа даць месца ў дзіцячым садку, дзяржава можа заплаціць за дзіця, адабраўшы частку грошай з бюджэту муніцыпалітэта», — прывёў ён прыклад, як дзяржава можа матываваць самакіравання вырашаць падобныя пытанні. А акрамя дзіцячых садкоў ёсць яшчэ нявырашаныя пытанні даступнасці жылля, падатковай палітыкі і многае іншае.

### ГАРАДЫ-ПРЫВІДЫ І «ЗНІКЛЫЯ» ВЫПУСКНІКІ

З'язджаюць і тыя, хто мог бы працаўладкавацца ў Латвіі. Так, летась высветлілася, што толькі 13 працэнтаў выпускнікоў медыцынскіх вышэйшых навучальных устаноў выходзіць на работу. Яшчэ 40 працэнтаў працягваюць вучобу ў рэзідэнтуры, а лёс 47 працэнтаў маладых спецыялістаў невядомы. Чыноўнікі дыпламатычна заявілі, што інфармацыя пра іх адсутнічае. Эксперты растлумачылі, што «зніклыя» выпускнікі з'ехалі за мяжу. Пры гэтым у самой Латвіі востра не хапае не толькі ўрачоў, але і медсясцёр.

Улады краіны ўсведамляюць праблему, але пераламаць сітуацыю не могуць. З 2018-га ў рэспубліцы дзейнічае праграма па вяртанні мігрантаў на радзіму. За тры гады ўгаварыць атрымалася 17 тысяч чалавек, але трацiна з іх пасля вяртання з'ехала з Латвіі зноў. Сумняваюцца ў правільнасці свайго рашэння і тыя, хто застаецца ў краіне. «У Латвіі нізкія заробкі, а падаткі ў паўтара-два разы вышэйшыя, чым у Вялікабрытаніі. Ад цябе толькі патрабуюць і патрабуюць. Цэны ў крамах такія ж і нават вышэйшыя. Вось і думайце, якое тут вар'яцтва», — канстатавала рээмігрантка Івета Зілэ.

«Латвія вымірае без войнаў і катастроф. Так хутка не раставалася ні водная дзяржава свету. Цэлыя рэгіянальныя цэнтры ператвараюцца ў пустыя гарады-прывіды. Фактычна ў Латвіі застануцца толькі старыя людзі, жыццё якіх будзе, на жаль, няшчаснае», — заўважыў журналіст Яніс Шкупеліс.

Няўмольная статыстыка пацвярджае трывожную сітуацыю: сёлета за студзень—верасень у Латвіі колькасць памерлых на 8080 чалавек перавысіла колькасць немаўлят. У кастрычніку насельніцтва зменшылася яшчэ на 936 чалавек. Па звестках Сусветнага банка за 1990—2019 гады, дэмаграфічная сітуацыя ў гэтай дзяржаве аказалася найгоршай сярод усіх краін постсавецкай прасторы. Eurostat адносіць Латвію да краін з найвышэйшым скарачэннем колькасці насельніцтва і ўзроўнем смяротнасці. Доля латвійцаў сярод жыхароў Еўрасаюза складае 0,4 працэнта. Характэрна, што Латвія страчвае людзей хутчэй, чым іншыя краіны Балтыі.

Эксперты лічаць, што змяніць сітуацыю Рызе будзе вельмі складана. «Дэмаграфічная палітыка вельмі інертная. Меры па стымуляванні нараджальнасці ў Латвіі не даюць выніку. Праз 2-3 пакаленні паўстане пытанне аб тым, што няма каму падтрымліваць латвійскую дзяржаўнасць. Будзе банальна не хапаць людзей для функцыянавання дзяржорганаў», — адзначыў iz.ru прэзідэнт Расійскай асацыяцыі прыбалтыйскіх даследаванняў Мікалай Мяжэвіч.

**Пётр ДУНЬКО.**

❍ Даслоўна

### Каштоўнасць чалавечых сувязяў

**«У сучасных абставінах незалежна ад палітычнай і эканамічнай кан'юнктуры, нягледзячы на бязліпасныя выклікі і пагрозы, з якімі сутыкаюцца ўсе краіны свету, менавіта бліжэйшыя суседзі павінны захаваць каштоўнасць чалавечых сувязяў, эканамічных і гуманітарных кантактаў, — адзначаецца ў віншаванні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з нагоды 102-й гадавіны абвяшчэння Латвійскай Рэспублікі. — Беларусаў і латышоў спрадвеку аб'ядноўвалі брацкія, добрасуседскія адносіны, пазітыўны вопыт мірнага суіснавання многіх пакаленняў. Не дазволім гэта сапсаваць і разбурыць! Толькі разам, у згодзе і міры, мы здолеем перадолець усе цяжкасці і нягоды».**

Кніжны гасцінец

# Барадулін скакаў па матрацах, а Караткевіч пляскаў у ладкі і рагатаў

**Вячаслаў Рагойша. Дзесяць саг пра Караткевіча. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2020.**




Пісаць пра сябра, пісаць пра класіка? Сухія факты альбо эмацыянальныя ўспаміны?

Прафесар БДУ Вячаслаў Рагойша знаходзіць прымальны сінтэз.

Ён глядзіць на Уладзіміра Караткевіча вачыма і сябра, і навукоўца. Сустрэчы ў дзесяці сагах — менавіта так называюцца раздзелы, адпаведна з эпічнасцю персанажа. Вось самая першая сустрэча: 1963 год. Студэнт Рагойша бачыць пісьменніка: «Высокі, прыгожы, крыху, як нам падалося, сутулаваты, элегантна апрануты і, што нас асабліва ўразіла, — з рознакаляровымі вачыма».

Пазней ужо выкладчык Вячаслаў Рагойша палюбіў задаваць студэнтам пытанне: «Скажыце, з каго Іван Мележ у сваёй «Палескай хронікі» мог запазычыць такую партрэтную дэталь для вобраза Васіля Дзятліка: вочы ў яго былі розныя, адно блакітнае, а другое рудое, як жалудок?»

Вядома, Мележ наўрад ці «спісваў» гэта з Караткевіча, але ж падабенства ў такой дзіўнай дэталі ўражвае!

А ў канцы мая 1966 года дзверы 341-га пакоя аспіранцкага інтэрната па вуліцы Кастрычніцкай, 2 расчыніліся, і малады Адам Мальдзіс прывёў сябру Рагойшу высокага, стройнага чалавека ў белай вышыванай кашулі. Так пачалося сяброўства аўтара кнігі з Караткевічам.

Сага пра абарону дысертацыі Вячаслава Рагойшы па паэзіі Максіма Танка. Падтрымаць сябра прыйшоў Караткевіч, які яшчэ і замалёўваў убачанае. А пасля ўручыў наваспечанаму кандыдату навук уласнаручна намаляваны «Дыплём» — багіня Перамогі з запаленай паходняй сядзіць на спіне Льва, сімвала моцы і ўлады, і подпіс: «Светачу чалавецтва ад сяброў-падсвечнікаў»...

А вось у Сваткаўскай школе шаноўная літаратарская кампанія заначавала... у прасторнай спартыўнай зале, на звычайных спартыўных матрацах, матах, якія і падсцілалі пад сябе, якімі і накрываліся, і... кідаліся адзін у аднаго. Можаце ўявіць маладога Рыгора Барадуліна, які з рогатам скача на матрацах, што накрываюць Вячаслава Рагойшу, а Караткевіч назірае збоку і пляскае ў ладкі: «Ці ж не шчасце на такі канцэрт папасці?! Ці не геніяльна звездаць прытопу на самой спіне нашага прафесара? Гоп-гопа!.. Гоп-гопа!..»

А вось «вяселле веку» ў Ракаве — Вячаслаў Рагойша бярэ шлюб з Таццянай Кабржыцкай, сваёй калегай і дачкой знакамітага оперных спевака са Львова. Караткевіч тады ўпершыню прадставіў сябрам сваю будучую жонку Валянціну, якая так па-заліхвацку танцавала, што зламала абцас.

Праз дзясятак гадоў Рагойшы і Караткевічы пасяліліся ў суседніх пад'ездах дома на Карла Маркса, 36. Як вядома, у Караткевіча не было сваіх дзяцей, і крайняна чытаць, як любіў ён бавіцца з маленькімі Рагойшамі. «Аднойчы прыйшоў да нас, а я люляю на руках Пятрусіка. Тут жа намаляваў нас дваіх у выглядзе... коцікаў. І падпісаў: «Тата — кот Рагойша з малым кацяняткам — рагайшаняткам. Ул. Караткевіч».

Паступовае згасанне... Праблемы са здароўем... У канцы лютага 1984 года з дыягназам «цыроз печані, пячоначная кома» Караткевіча паклалі ў рэанімацыю Лечкамісіі. Рагойшы наведалі сябра, запрасілі ўлетку да сябе ў Ракаў. Гэта магло быць не проста гасцяванне... Да Рагойшаў мусілі прыехаць з Масквы знакамітыя сваякі — сям'я кінематаграфістаў Бадровых. Знаёмства з Караткевічам магло скончыцца стварэннем фільма па адным з ягоных шэдэўраў. Гаспадары планавалі, як найлепш правесці сустрэчу, чакалі толькі, калі Караткевіч вернецца з падарожжа па Прыпяці... Тое падарожжа стала апошнім. «На пахаванне Караткевіча ў Мінск мы паехалі разам з Бадровымі. На ракаўскіх палетках наш Максім і яго равеснік Сяргей Бадроў-малодшы нарвалі нажамі цэлы сноп жыта, перавязалі яго васільковым перавяслам, потым надламалі верхнюю частку снапа»... Сімвалічнага «каласы пад сярпом тваім» былі ўскладзены на магілу...

«20 лістапада 1739 года. Мілы мой хлопчык, ты заняты гісторыяй Рыма»

**Ф. Д. С. Чэстэрфілд. Лісты да сына. Масква, «Рыпал-класік», 2019**




І ў васямнаццатым стагоддзі далёка не кожны мог адправіць сваё дзіця ў адукацыйнае падарожжа па Італіі... Канешне, калі ты не багаты лорд, якім быў Чэстэрфілд.

У сусветную літаратуру лорд увайшоў выпадкова і пасмяротна. Пачалося з любоўнага скандалу. Ледзь не на спрэчку спакусіў у Гаазе бедную гувернантку Элізабет дзю Бушэ. Тая нарадзіла сына, якога Чэстэрфілд прызнаў сваім. Лорд забяспечыў бастарду Філіпу бліскучае выхаванне і ўсё жыццё пісаў павучальныя лісты. А потым жонка Філіпа прадала іх выдаўцам. Зборнік выклікаў шок... і стаў папулярным чытвом на стагоддзі. Хоць лісты доўгія, і, як на сённяшні густ, занадта маралізатарскія. Вальтэр высока цаніў гэтыя павучанні, а вось Дыкенс вывеў іх аўтара ў адным са сваіх раманаў як эгаістычнага і лжывага арыстакрата. Сёння з асаблівай асаладай чытаюцца радкі з экзотыкай свецкіх салонаў. «Ты ўступаеш у свет — беражыся ж людзей, што прапаноўваюць табе сваё сяброўства. Будзь з імі вельмі пачцівы, але разам з тым вельмі недаверлівы; адказвай ім ветласцю, але толькі не шчырасцю. Не дазваляй самалюбству тваймў і фанабэрыі спакушаць сябе думкаю, што людзі могуць стаць тваімі сябрамі з першага погляду ці пасля непрацяглага знаёмства. Сапраўднае сяброўства выспявае павольна і расцвітае толькі там, дзе людзі сапраўды даказалі яго адзін аднаму»...

І асобнае задавальненне — уявіць, як чыталі гэты зборнік вальнадумцы з сем'яў Радзівілаў, Агінскіх ці Сапегаў у Нясвіжы, Слоніме альбо Ружанах.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

*Выданні для агляду прадстаўлены кніжным магазінам «Акадэмічная кніга», Мінск, пр-т Незалежнасці, 72.*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.57 | 16.56 | 7.59 |
| Віцебск — | 8.53 | 16.39 | 7.46 |
| Магілёў — | 8.47 | 16.46 | 7.59 |
| Гомель — | 8.36 | 16.50 | 8.14 |
| Гродна — | 9.11 | 17.13 | 8.02 |
| Брэст — | 9.05 | 17.21 | 8.16 |

### Месяц

*Першая квадра 22 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

*Пр. Германа, Івана, Нікіфара.*
*К. Катарыны, Кандрата, Леанарда, Лявона, Сільвестра.*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Неяк Пятровіч падарыў жонцы набор дарагога посуду.**

**Усе знаёмыя былі вельмі здзіўлены такой незвычайнай для Пятровіча шчодрасцю.**

**— Іван, што здарылася, адкуль такая марнатраўнасць?!**

**— Затое цяпер Галіна мые яго сама!**

— Валянціна Маркаўна! Ну навошта так старацца выглядаць маладой?

— Ну, па-першае, я прывыкла...

**— Ты мяне кахаеш?**

**— Вядома, дарагая!**

**— Так, што нават гатовы за мяне памерці?**

**— Але хто ж тады будзе цябе кахаць?!**




Даты | Падзеі | Людзі

**26 ЛІСТАПАДА**

**У краіне**

**1805** год — нарадзіўся (цяпер Салігорскі раён) Яўстафій Янушкевіч, беларускі кнігавыдавец, публіцыст, мемуарыст. Скончыў Віленскі ўніверсітэт. З 1826-га адвакат, сакратар камісіі па спадчыне Радзівілаў. Адзін з арганізатараў паўстання 1830—1831 гадоў на тэрыторыі Ашмянскага, Слуцкага і Навагрудскага паветаў. Эмігрыраваў у Францыю, удзельнічаў у арганізацыі польскай эмігранцкай прэсы ў Парыжы.

**1925** год — нарадзіўся Юрый Уладзіміравіч Семяняка, кампазітар, народны артыст Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.



**1930** год — нарадзіўся Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч, беларускі пісьменнік. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа, Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**2000** год — у Оршы ў сувязі з 70-годдзем з дня нараджэння беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча адкрыты яго музей.

**У свеце**

**1975** год — нарадзіўся Максім Віктаравіч Аверын, расійскі акцёр тэатра, кіно і тэлебачання, рэжысёр, тэлевядучы, заслужаны артыст Расійскай Федэрацыі.

У гэты ж дзень нарадзіўся Антон Аляксандравіч Макарскі, расійскі акцёр тэатра і кіно, спявак.

**Так гаварылі...**

**ДАНІЭЛЬ ДЭФО:**

*«Усе нашы наракані на нястачу выцякаюць з недахопу ўдзячнасці за тое, што мы маем».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмны – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3524.

Нумар падпісаны ў 19.30 25 лістапада 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12